ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

А. ДЭМЕТРЫУС МАНУСАС



МОЖА, ГЭТА ТЫ?

ЯНКА, ПАДЫМАЙСЯ! ТЫ СПОЗНІШСЯ НА ІМШУ.
ДОБРА.
ЯНКА, Я ДУМАЛА, ШТО ТЫ ПАДНЯЎСЯ!
А?
МЫ МУСІМ ІСЦІ, БО ДА СВЯТОЙ ІМШЫ ЗАСТАЕЦЦА ЗУСІМ МАЛА ЧАСУ.
ДОБРА, МАМА.

ДЫК ТЫ ІДЗЕШ НА ІМШУ ЦІ НЕ?
АДКУЛЬ ТЫ УЗЯЎСЯ?
З НЕБА.
Я ТВОЙ АНЁЛ-АХОЎНІК, І Я НЕПАКОЮСЯ ПРА ЦЯБЕ.
ПРА МЯНЕ?
ЛЮБЫ АНЁЛ НЕПАКОІЎСЯ Б ПРА ТАГО, ХТО СПІЦЬ, ХОЦЬ ПАВІНЕН ІСЦІ НА ІМШУ.
АЛЕ Ж Я СТАМІЎСЯ.
СТАМІЎСЯ ТАК, ЯК ЁН?
ГЭТА ЕЗУС!


ЕЗУС НЁС ГЭТЫ КРЫЖ, КАБ ТЫ МОГ ХАДЗІЦЬ НА ІМШУ.
Я НЕ ВЕДАЎ.
МОЖА, ТЫ НЕ ВЕДАЕШ, НАВОШТА ЁН ПАМЁР НА КРЫЖЫ?
КАБ ЗБАВІЦЬ МЯНЕ АД ГРАХУ.
І ЯК ГЭТА ЗБАВІЛА ЦЯБЕ?
ЕЗУС АХВЯРАВАЎ СЯБЕ БОГУ.
ТАК, АЛЕ ТРЭБА ТАКСАМА, КАБ ТЫ ПРЫНЁС СЯБЕ Ў АХВЯРУ БОГУ РАЗАМ З ЕЗУСАМ.
ПРАЎДА?
INRI
ТЫ ПАВІНЕН АХВЯРАВАЦЬ СЯБЕ, ЯК МАРЫЯ І ЯН. ТАБЕ ТРЭБА ДАЛУЧЫЦЦА ДА ІХ НА ГАЛГОФЕ.
АЛЕ Ж ГЭТА ЗДАРЫЛАСЯ ВЕЛЬМІ ДАЎНО!

ЕЗУС ПАДБАЎ ПРА ГЭТА, БАЧЫШ?
АПОШНЯЯ ВЯЧЭРА.
БЯРЫЦЕ І ЕШЦЕ. ГЭТА ЦЕЛА МАЁ.
БЯРЫЦЕ І ПІЦЕ ЎСЕ. ГЭТА МАЯ КРОЎ НОВАГА ЗАПАВЕТУ, ЯКАЯ ЗА МНОГІХ БУДЗЕ ПРАЛІТА НА АДПУШЧЭННЕ ГРАХОЎ.
ЕЗУС СЛУЖЫЦЬ ПЕРШУЮ ІМШУ І ДАЕ АПОСТАЛАМ УЛАДУ СЛУЖЫЦЬ ЯЕ І ПАСВЯЧАЦЬ ІНШЫХ СВЯТАРОЎ, КАБ ЯНЫ СЛУЖЫЛІ ІМШУ.
ГЭТА ЧЫНІЦЕ НА МАЮ ПАМЯЦЬ.
МЕНАВІТА ТАК ЕЗУС ПАДРЫХТАВАЎ ТАБЕ ШЛЯХ НА ГАЛГОФУ.
СХАДЗІЦЬ НА ІМШУ — ГЭТА ЯК СТАЯЦЬ КАЛЯ КРЫЖА?
КОЖНЫ РАЗ ПАДЧАС ІМШЫ ТЫ ПРЫНОСІШ СЯБЕ Ў АХВЯРУ РАЗАМ З ЕЗУСАМ НА КРЫЖЫ.
АЛЕ ЯКІМ ЧЫНАМ?


НА ІМШЫ ТЫ ЯДНАЕШСЯ З ЕЗУСАМ. ПОТЫМ ЕЗУС ПРЫНОСІЦЬ У АХВЯРУ СЯБЕ І ЦЯБЕ РАЗАМ З САБОЮ.
ТАК БОГ НАПЭЎНА ПРЫМЕ МЯНЕ!
БОГ ПРЫМЕ ЦЯБЕ З ЕЗУСАМ, І ЁН ПРЫМАЕ ЎСЁ, ШТО ТЫ АХВЯРУЕШ НА ІМШЫ.
Я РАНЕЙ НЕ ВЕДАЎ ПРА ГЭТА.
ЯК ТЫ ДУМАЕШ, НАВОШТА ХАДЗІЦЬ У НЯДЗЕЛЮ НА ІМШУ?
БО ТАК КАЖА КАСЦЁЛ, А ІНАКШ ТЫ РОБІШ СМЯРОТНЫ ГРЭХ.
А ЧАМУ КАСЦЁЛ КАЖА, ШТО ГЭТА СМЯРОТНЫ ГРЭХ?
Я НЕ ВЕДАЮ.
ТАМУ ШТО ЎДЗЕЛ У СВЯТОЙ ІМШЫ — ГЭТА САМЫ ДАСКАНАЛЫ СПОСАБ УШАНАВАЦЬ БОГА.
БОЖА, Я, ЗДАЕЦЦА, НІЧОГА НЕ ВЕДАЮ.
ПРАЧЫТАЙ ГЭТУЮ КНІГУ, І ТЫ ДАВЕДАЕШСЯ ПРА ВАЖНЫЯ РЭЧЫ.
ДОБРА!
KNOW YOUR MASS
НА НАСТУПНЫХ СТАРОНКАХ ТЫ ДАВЕДАЕШСЯ, ШТО БЫЛО Ў КНІЗЕ ЯНКІ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ПЕРШАЯ: УСЕ АПРАНАЮЦЦА

КОЛЕР МАНІПУЛА, СТУЛЫ І АРНАТА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СВЯТА ЦІ ІМШЫ.

БЕЛЫ (ЧЫСЦІНЯ):	У СВЯТЫ ПАНА, ДЗЕВЫ МАРЫІ І СВЯТЫХ, ЯКІЯ НЕ БЫЛІ МУЧАНІКАМІ.
ЧЫРВОНЫ (ЛЮБОЎ):	У СВЯТЫ СВЯТОГА ДУХА, НАЙДАРАЖЭЙШАЙ КРЫВІ І МУЧАНІКАЎ.
ФІЯЛЕТАВЫ (ПАКАЯННЕ):	У ПАКУТНЫЯ ПЕРЫЯДЫ, АСАБЛІВА Ў АДВЭНТ І ВЯЛІКІ ПОСТ.
ЧОРНЫ (СМУТАК):	У ВЯЛІКУЮ ПЯТНІЦУ І НА ІМШАХ ЗА ПАМЕРЛЫХ.
ЗЯЛЁНЫ (НАДЗЕЯ):	У ДНІ, КАЛІ НЕ ПРАДПІСАНЫ ІНШЫ КОЛЕР.


ЦЯПЕР Я БУДУ АПРАНАЦЦА НА ІМШУ, АЛЕ МАЛІТВЫ БУДУ КАЗАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ. НАЗАВІ АДЗЕННЕ, ЯКОЕ Я БУДУ АПРАНАЦЬ.
ДАЙ, ПАНЕ, МОЦ РУКАМ МАІМ ДЛЯ ЗНІШЧЭННЯ ЎСЯЛЯКАЙ ПЛЯМЫ, КАБ Я БЕЗ ЗАБРУДЖАНАСЦІ РОЗУМУ І СЭРЦА МОГ СЛУЖЫЦЬ ТАБЕ.
УСКЛАДЗІ, ПАНЕ, НА ГАЛАВУ МАЮ ШЛЕМ ЗБАЎЛЕННЯ ДЛЯ АДБІЦЦЯ ЎСІХ Д'ЯБАЛЬСКІХ АТАК.
ВЫБЕЛІ МЯНЕ, ПАНЕ, І АЧЫСЦІ СЭРЦА МАЁ, КАБ Я, ВЫБЕЛЕНЫ КРЫВЁЮ ЯГНЯЦІ, ЦЕШЫЎСЯ РАДАСЦЮ ВЕЧНАЙ.
ПАДПЕРАЖЫ МЯНЕ, ПАНЕ, ПАСАМ ЧЫСЦІНІ І ЗГАСІ Ў СЦЁГНАХ МАІХ ПАЖАДЛІВАСЦЬ, КАБ ПРАБЫВАЛА ЎВА МНЕ ДАБРАДЗЕЙНАСЦЬ САМАВАЛОДАННЯ І БЕЗЗАГАННАСЦІ.
ПАНЕ, УЧЫНІ МЯНЕ ГОДНЫМ НАСІЦЬ МАНІПУЛ ПЛАЧУ І ТУГІ, КАБ Я З РАДАСЦЮ АТРЫМАЎ УЗНАГАРОДУ ЗА ПРАЦУ.

ВЯРНІ МНЕ, ПАНЕ, ВОПРАТКУ НЕСМЯРОТНАСЦІ, ЯКУЮ Я СТРАЦІЎ ПРАЗ АДСТУПНІЦТВА ПРААЙЦОЎ; І ХОЦЬ Я НЯВАРТЫ НАБЛІЗІЦЦА ДА ТВАІХ СВЯТЫХ ТАЯМНІЦАЎ, ДАЙ МНЕ АДНАК ЗАСЛУЖЫЦЬ РАДАСЦЬ ВЕЧНУЮ.
ПАНЕ, ЯКІ СКАЗАЎ: "ЯРМО МАЁ ПРЫЕМНАЕ, І ЦЯЖАР МОЙ ЛЁГКІ", ДАЙ МНЕ ЯГО НЕСЦІ ТАК, КАБ ДАСЯГНУЦЬ ТВАЁЙ ЛАСКІ.
ЦІ ЗМОГ ТЫ ПРАВІЛЬНА НАЗВАЦЬ УСЕ ПРАДМЕТЫ АДЗЕННЯ? ЦЯПЕР ДАВАЙ Я ПАКАЖУ ТАБЕ КЕЛІХ І ІНШЫЯ ПРАДМЕТЫ.
КЕЛІХ — ГЭТА КАШТОЎНАЯ РЭЧ. УСЯРЭДЗІНЕ ЁН ЗАЎСЁДЫ ЗАЛАТЫ.
ПОПЕРАК КЕЛІХА Я КЛАДУ ПУРЫФІКАТАР, ІЛЬНЯНУЮ ТКАНІНУ ДЛЯ АЧЫСТКІ КЕЛІХА ПАДЧАС ІМШЫ.
ЗВЕРХУ Я КЛАДУ ПАТЭНУ, ЗАЛАТУЮ ТАЛЕРАЧКУ.

НА ПАТЭНУ Я КЛАДУ КРУГЛЫ КАВАЛАК ХЛЕБА, ЯКІ НАЗЫВАЕЦЦА ГОСТЫЯЙ.
Я НАКРЫВАЮ ГОСТЫЮ ЦВЁРДЫМ ІЛЬНЯНЫМ КВАДРАТАМ — ПАЛАЙ.
УСЁ ГЭТА Я НАКРЫВАЮ ВЭЛЮМАМ ТАГО Ж КОЛЕРУ, ЯК І МОЙ АРНАТ.
КАРПАРАЛ, СКЛАДЗЕНЫ ІЛЬНЯНЫ КВАДРАТ, Я КЛАДУ Ў КАНВЕРТ, ЯКІ ЗАВЕЦЦА БУРСАЙ.
КОЛЕР БУРСЫ АДПАВЯДАЕ КОЛЕРУ ВЭЛЮМА. ЦЯПЕР Я ГАТОВЫ ДА ІМШЫ. АХ, ГАЛАЎНЫ ЎБОР! ЁН ЗАВЕЦЦА БІРЭТАЙ.
ЦЯПЕР ДАВАЙ ПАГЛЯДЗІМ НА АЛТАР, ЯКІ ТАКСАМА ТРЭБА АПРАНУЦЬ НА ІМШУ.


НАД АЛТАРОМ АБО НА ІМ ПАВІНЕН ЗНАХОДЗІЦЦА КРЫЖ.
ПАДЧАС ІМШЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАПАЛЕНЫЯ ПРЫНАМСІ ДЗВЕ СВЕЧКІ.
АЛТАРНЫЯ КАРТКІ З МАЛІТВАМІ
КОМЖА
РУЧНІК ДЛЯ ВЫЦІРАННЯ РУК
МІСКА ДЛЯ АБМЫЦЦЯ РУК
ІМШАЛ, АБО КНІГА З МАЛІТВАМІ ДЛЯ ІМШЫ
АЛТАР НАКРЫВАЮЦЬ ТРЫМА АБРУСАМІ: ДВА З ІХ ПАКРЫВАЮЦЬ ТОЛЬКІ ВЕРХ, А АДЗІН СПАДАЕ З АБОДВУХ БАКОЎ.
У ЦЭНТРЫ АЛТАРА ЗНАХОДЗІЦЦА АЛТАРНЫ КАМЕНЬ З РЭЛІКВІЯМІ СВЯТЫХ.
ДЗВЕ АМПУЛКІ: АДНА З ВАДОЙ І АДНА З ВІНОМ.
КРЭДЭНС
СУТАНА
ЗВАНОЧАК

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ДРУГАЯ: ДЗВЕ ІМШЫ Ў АДНОЙ

ПЕРАД ТЫМ ЯК ПАЗНАЁМІЦЦА З ЧАСТКАМІ ІМШЫ, ТАБЕ ТРЭБА ЗРАЗУМЕЦЬ ІМШУ ЦАЛКАМ. УСЯ ІМША ДЗЕЛІЦЦА НА ДЗВЕ ЧАСТКІ:

1. ІМША КАТЭХУМЭНАЎ

ДЛЯ КАГО:	МЭТА:
ДЛЯ КАТАЛІКОЎ І ТЫХ, ХТО РЫХТУЕЦЦА СТАЦЬ КАТАЛІКАМІ.	ПАМАЛІЦЦА І АТРЫМАЦЬ НАСТАЎЛЕННЕ.

2. ІМША ВЕРНІКАЎ

ДЛЯ КАГО:	МЭТА:
ТОЛЬКІ ДЛЯ КАТАЛІКОЎ.	ЗНОЎ СКЛАСЦІ АХВЯРУ КРЫЖА І ПРЫНЯЦЬ НАШАГА ПАНА Ў СВЯТОЙ КАМУНІІ.



КАЛІ ПАЗНАЁМІШСЯ З АСТАТНІМІ ЧАСТКАМІ ГЭТАЙ КНІГІ, ВЯРТАЙСЯ І ПАГЛЯДЗІ ГЭТЫЯ МАЛЮНКІ ЗНОЎ.

ЦЯПЕР ПАГЛЯДЗІ НА ІМШУ КАТЭХУМЭНАЎ.
У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ МЫ Ў МАЛІТВЕ ПАДЫМАЕМСЯ НАСУСТРАЧ БОГУ
(ПРЫ ДАПАМОЗЕ ЯГО ЛАСКІ, ВЯДОМА).
У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ЁН ПАДЫМАЕ НАС ДА СЯБЕ, ДАЮЧЫ НАМ НАСТАЎЛЕННЕ
(А ЯГОНАЯ ЛАСКА ДАПАМАГАЕ НАМ СЛУХАЦЬ).

ТАМУ ПЕРШАЯ ЧАСТКА НАГАДВАЕ ЗВЫКЛЫЯ ПРЫСТУПКІ,
А ДРУГАЯ ЧАСТКА — МЕХАНІЧНЫ ЭСКАЛАТАР.



ЗВЫКЛЫЯ ПРЫСТУПКІ: ПРАЦУЕМ МЫ. РУХОМЫЯ ПРЫСТУПКІ: ПРАЦУЕ БОГ.

ЦЯПЕР ПАГЛЯДЗІ НА ПРЫСТУПКІ З ІНШАГА БОКУ.
У МАЛІТОЎНАЙ ЧАСТЦЫ МЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЕМ ЧАТЫРЫ ВЯЛІКІЯ ФОРМЫ МАЛІТВЫ.
У ЧАСТЦЫ НАСТАЎЛЕННЯ БОГ ВЫКАРЫСТОЎВАЕ ТРЫ ВЯЛІКІЯ СРОДКІ НАВУЧАННЯ.



ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ: ПАДРЫХТОЎКА



ЦЯПЕР ПАЧЫНАЕЦЦА ІМША. УВАЖЛІВА САЧЫ ЗА СВЯТАРОМ.

ПЕРАД ТЫМ ЯК СВЯТАР ВЫЙДЗЕ З САКРЫСТЫІ, ТЫ ЎЖО ПАВІНЕН ЧАКАЦЬ НА СВАІМ МЕСЦЫ.

ЦЯПЕР УСТАНЬ.



ТЫ ЎКЛЕНЧЫЎ ПЕРАД ТЫМ, ЯК ПАЙСЦІ ДА ЛАЎКІ. СВЯТАР УКЛЕНЧВАЕ ЦЯПЕР.

КЛЕНЧАЧЫ ПЕРАД БОГАМ, СХІЛІ ПРАВАЕ КАЛЕНА ДА ЗЯМЛІ:

УЗЯЎШЫ КАРПАРАЛ З БУРСЫ, СВЯТАР РАСКЛАДАЕ ЯГО НА ТЫМ МЕСЦЫ, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЦЦА АЛТАРНЫ КАМЕНЬ.

НАЙСВЯЦЕЙШЫ САКРАМЭНТ ПАВІНЕН ЗАЎСЁДЫ ЗНАХОДЗІЦЦА НА КАРПАРАЛЕ.

ЦЯПЕР СВЯТАР АДКРЫВАЕ КНІГУ ДЛЯ ІМШЫ (АБО ІМШАЛ) НА АДПАВЕДНАЙ СТАРОНЦЫ.

ІМШАЛ ЗНАХОДЗІЦЦА НА АДМЫСЛОВАЙ ПАДСТАЎЦЫ І МАЕ ЗАКЛАДКІ.



ЗАТЫМ СВЯТАР ВЯРТАЕЦЦА ДА ПРЫСТУПАК АЛТАРА І ЎКЛЕНЧВАЕ.

ЦЯПЕР СТАНЬ НА КАЛЕНІ.

ІМША ПАЧЫНАЕЦЦА ЗНАКАМ КРЫЖА. ЗРАБІ ЯГО РАЗАМ СА СВЯТАРОМ. ПАГЛЯДЗІ, ЯК ЁН РОБІЦЦА.

ПРА ШТО НАМ КАЖА ЗНАК КРЫЖА?



ГЭТЫ ЗНАК КАЖА НАМ ПРА ТОЕ, ШТО БОГ СТАЎ ЧАЛАВЕКАМ І ПАМЁР ЗА НАС.

СЛОВЫ КАЖУЦЬ НАМ ПРА ТОЕ, ШТО БОГ АДЗІНЫ Ў ТРОХ АСОБАХ.

АДЗІНЫ БОГ — У ІМЯ

ТРЫ АСОБЫ — АЙЦА,
І СЫНА,
І ДУХА СВЯТОГА.

СВЯТАР: СУДЗІ МЯНЕ, БОЖА, І РАЗБЯРЫ СПРАВУ МАЮ З НЕСВЯТЫМ НАРОДАМ; АД ЧАЛАВЕКА ЗЛОГА І КРЫВАДУШНАГА ЎРАТУЙ МЯНЕ.

МІНІСТРАНТ: БО ТЫ, БОЖА, МОЦ МАЯ: ЧАМУ ТЫ МЯНЕ АДЦУРАЎСЯ І ЧАМУ СУМНЫ ХАДЖУ Я, КАЛІ ЎЦІСКАЕ МЯНЕ ВОРАГ?

СВЯТАР: ПАШЛІ СВЯТЛО ТВАЁ І ПРАЎДУ ТВАЮ, КАБ ЯНЫ ВЯЛІ МЯНЕ І КАБ ЗАВЯЛІ НА ГАРУ ТВАЮ СВЯТУЮ І Ў СЯЛІБЫ ТВАЕ.

МІНІСТРАНТ: І ПАДЫДУ ДА АХВЯРНІКА БОЖАГА, ДА БОГА, ЯКІ ВЕСЯЛІЦЬ МАЛАДОСЦЬ МАЮ.

СВЯТАР: БУДУ ХВАЛІЦЬ ЦЯБЕ ПАД ГУКІ ЛЮТНІ, БОЖА, БОЖА МОЙ; ЧАМУ ЖУРЫШСЯ, ДУША МАЯ, І ЧАМУ ЎВА МНЕ НЕПАКОІШСЯ?

МІНІСТРАНТ: СПАДЗЯВАЙСЯ НА БОГА, БО ЯШЧЭ ЯГО БУДУ ХВАЛІЦЬ, ЗБАЎЛЕННЕ АБЛІЧЧА МАЙГО І БОГА МАЙГО.

СВЯТАР: ХВАЛА АЙЦУ, І СЫНУ, І ДУХУ СВЯТОМУ.

МІНІСТРАНТ: ЯК БЫЛА СПРАДВЕКУ, ЦЯПЕР, І ЗАЎСЁДЫ, І НА ВЯКІ ВЕЧНЫЯ. АМЭН.

СВЯТАР І МІНІСТРАНТ ЧЫТАЮЦЬ ПСАЛЬМ 42.

ГЭТЫ ПСАЛЬМ НАПІСАЎ КАРОЛЬ ДАВІД, КАБ ВЫКАЗАЦЬ, ЯК МОЦНА ЁН ХАЦЕЎ ПАДЫСЦІ ДА БОЖАГА АХВЯРНІКА.

ЁН ПАВІНЕН ВЫКАЗВАЦЬ НАШУЮ РАДАСЦЬ АД МАГЧЫМАСЦІ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ІМШЫ.

У ДАЎНІЯ ЧАСЫ СВЯТАР ЧЫТАЎ ГЭТЫ ПСАЛЬМ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ПЕРАД ТЫМ, ЯК ПАДЫСЦІ ДА АЛТАРА. ЦЯПЕР ЁН ПРАМАЎЛЯЕЦЦА НА ІМШЫ, АЛЕ ГЭТА ТАКСАМА ПАДРЫХТОЎКА.

СВЯТАР: ПАДЫДУ ДА АХВЯРНІКА БОЖАГА.

МІНІСТРАНТ: ДА БОГА, ЯКІ ВЕСЯЛІЦЬ МАЛАДОСЦЬ МАЮ.

НА ІМШЫ ЕЗУС БУДЗЕ ПРЫНЕСЕНЫ Ў АХВЯРУ ЗА НАШЫЯ ГРАХІ. ТАМУ СПАЧАТКУ МЫ КАЖАМ ЯМУ, ШТО ШКАДУЕМ ЗА ІХ.

МАРЫЯ МАГДАЛЕНА МОЦНА ШКАДАВАЛА ЗА СВАЕ ГРАХІ, ТАМУ ЕЗУС НЕ ТОЛЬКІ ПРАБАЧЫЎ ЯЕ, АЛЕ І МОЦНА ПАЛЮБІЎ.

КАЛІ МЫ САПРАЎДЫ ШКАДУЕМ ЗА СВАЕ ГРАХІ, ТАДЫ МЫ МОЖАМ ПРЫНЯЦЬ ЛЮБОЎ ЕЗУСА.

СПАЧАТКУ СВЯТАР ВЫКАЗВАЕ ЖАЛЬ ЗА СВАЕ ГРАХІ.

ПАКУЛЬ ЁН РОБІЦЬ ГЭТА, ПАМАЛІСЯ ЗА СВЯТАРА, ЯКІ СЛУЖЫЦЬ ІМШУ. ЁН ПРАДСТАЎЛЯЕ ЦЯБЕ ПЕРАД БОГАМ, І ТЫ МУСІШ ЧАСТА МАЛІЦЦА ЗА ЯГО.

МІНІСТРАНТ: СПАВЯДАЮСЯ БОГУ ЎСЕМАГУТНАМУ, НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ЗАЎСЁДЫ ПАННЕ МАРЫІ, СВЯТОМУ МІХАЛУ АРХАНЁЛУ, СВЯТОМУ ЯНУ ХРЫСЦІЦЕЛЮ, СВЯТЫМ АПОСТАЛАМ ПЯТРУ І ПАЎЛУ, УСІМ СВЯТЫМ І ТАБЕ, ОЙЧА, ШТО ЗГРАШЫЎ Я ВЕЛЬМІ ДУМКАЮ, СЛОВАМ І ЎЧЫНКАМ: МАЯ ВІНА, МАЯ ВІНА, МАЯ ВЕЛЬМІ ВЯЛІКАЯ ВІНА. ТАМУ ПРАШУ НАЙСВЯЦЕЙШУЮ ЗАЎСЁДЫ ПАННУ МАРЫЮ, СВЯТОГА МІХАЛА АРХАНЁЛА, СВЯТОГА ЯНА ХРЫСЦІЦЕЛЯ, СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА, УСІХ СВЯТЫХ І ЦЯБЕ, ОЙЧА, ПАМАЛІЦЦА ЗА МЯНЕ ДА ПАНА, БОГА НАШАГА.

СВЯТАР: НЯХАЙ ЗМІЛУЕЦЦА НАД ВАМІ БОГ УСЕМАГУТНЫ І, АДПУСЦІЎШЫ ВАМ ГРАХІ ВАШЫЯ, ДАВЯДЗЕ ВАС ДА ЖЫЦЦЯ ВЕЧНАГА.

МІНІСТРАНТ: АМЭН.

ЦЯПЕР ПРЫЙШЛА ЧАРГА ВЕРНІКАЎ СКАЗАЦЬ БОГУ, ШТО ЯНЫ ШКАДУЮЦЬ ЗА СВАЕ ГРАХІ.

ПРАМАЎЛЯЙ CONFITEOR РАЗАМ З МІНІСТРАНТАМ. ВЫВУЧЫ ЯГО, КАЛІ ЯШЧЭ НЕ ВЕДАЕШ ЯГО НА ПАМЯЦЬ.

МАЛІТВЫ КАЛЯ ПРЫСТУПАК АЛТАРА З'ЯЎЛЯЮЦЦА ПРЫВАТНЫМІ МАЛІТВАМІ СВЯТАРА І ВЕРНІКАЎ. ЯНЫ ПАДРЫХТОЎВАЮЦЬ ІХ ДА ІМШЫ.

КАЛІ ЦЭЛЕБРУЕЦЦА СПЯВАНАЯ ІМША, У ГЭТЫ ЧАС ХОР БУДЗЕ СПЯВАЦЬ "АГУЛЬНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ".

ГЭТАЯ АГУЛЬНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ЗАВЕЦЦА ІНТРОІТАМ.

СВЯТАР: АКАЖЫ НАМ, ПАНЕ, ТВАЮ МІЛАСЭРНАСЦЬ.
МІНІСТРАНТ: І ДАЙ НАМ ТВАЁ ЗБАЎЛЕННЕ.
СВЯТАР: ПАНЕ, ВЫСЛУХАЙ МАЮ МАЛІТВУ.
МІНІСТРАНТ: А ПРОСЬБА МАЯ НЯХАЙ ДА ЦЯБЕ ДОЙДЗЕ.
СВЯТАР: ПАН З ВАМІ.
МІНІСТРАНТ: І З ДУХАМ ТВАІМ.

ПЕРАД ТЫМ ЯК САМОМУ ПРАЧЫТАЦЬ ІНТРОІТ, СВЯТАР УЗЫХОДЗІЦЬ ДА АЛТАРА, ЗНОЎ ПРОСІЦЬ ПРАБАЧЭННЯ ЗА СВАЕ ГРАХІ І ЦАЛУЕ АЛТАРНЫ КАМЕНЬ.

АЛТАРНЫ КАМЕНЬ ЛЯЖЫЦЬ У СЯРЭДЗІНЕ АЛТАРА.



КАМЕНЬ АСВЯЧАЕ БІСКУП.

АЛТАР, А АСАБЛІВА АЛТАРНЫ КАМЕНЬ, СІМВАЛІЗУЕ ЦЕЛА ХРЫСТА, ТАМУ ЯГО ЦАЛУЮЦЬ З ПАШАНАЙ.

ПАДЫШОЎШЫ НА БОК ПАСЛАННЯ, СВЯТАР СТАНОВІЦЦА ПЕРАД ІМШАЛАМ І РОБІЦЬ ЗНАК КРЫЖА. ЦЯПЕР СВЯТАР ЧЫТАЕ ІНТРОІТ, ПЕРШУЮ ЗМЕННУЮ ЧАСТКУ ІМШЫ. НА СПЯВАНАЙ ІМШЫ ІНТРОІТ СПЯВАЕ ТАКСАМА І ХОР.

ПАГЛЯДЗІ, ЯК СВЯТАР СХІЛЯЕ ГАЛАВУ КОЖНЫ РАЗ, КАЛІ КАЖА: «ХВАЛА АЙЦУ...»

ВЕЛЬМІ ЧАСТА ІНТРОІТ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЧАСТКАЙ ПСАЛЬМА. РАНЕЙ ПАДЧАС ПРАЦЭСІІ ДА АЛТАРА СПЯВАЛІ ЎВЕСЬ ПСАЛЬМ.

ЦЯПЕР ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА ТОЛЬКІ ЧАСТКА ПСАЛЬМА АБО ІНШЫ КАРОТКІ ВЕРШ. АЛЕ ІНТРОІТ ЎСЁ Ж АДЛЮСТРОЎВАЕ ХАРАКТЭРНУЮ СУТНАСЦЬ СВЯТА, ЯКОЕ ПРЫПАДАЕ НА ДАДЗЕНЫ ДЗЕНЬ. ТАМУ ІНТРОІТ НАЛЕЖЫЦЬ ДА ЗМЕННЫХ ЧАСТАК І ЗМЯНЯЕЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД СВЯТА.

У ГЭТАЙ КНІЗЕ ЎСЕ ЗМЕННЫЯ МАЛІТВЫ ЎЗЯТЫЯ З НЯДЗЕЛІ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ТРОЙЦЫ. ТВОЙ ІМШАЛ МАЕ ЗМЕННЫЯ МАЛІТВЫ ДЛЯ КОЖНАГА ДНЯ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ЧАЦВЁРТАЯ: РАЗМОВА З БОГАМ

ЦЯПЕР МЫ ГАТОВЫЯ ЗРАБІЦЬ СВОЙ ПЕРШЫ КРОК У ТОЙ ЧАСТЦЫ ІМШЫ КАТЭХУМЭНАЎ, ДЗЕ МЫ ПРАМАЎЛЯЕМ ДА БОГА.

ПЕРШЫ КРОК — ГЭТА KYRIE. УСЕ ІНШЫЯ МАЛІТВЫ ІМШЫ ЛАЦІНСКІЯ. ГЭТАЯ МАЛІТВА ПРАМАЎЛЯЕЦЦА ПА-ГРЭЧАСКУ, НА АДНОЙ З САМЫХ СТАРАЖЫТНЫХ МОВАЎ, НА ЯКІХ СЛУЖЫЛАСЯ ІМША.

СВЯТАР: ПАНЕ, ЗМІЛУЙСЯ. → **АЙЦЕЦ**
МІНІСТРАНТ: ХРЫСЦЕ, ЗМІЛУЙСЯ.
СВЯТАР: ХРЫСЦЕ, ЗМІЛУЙСЯ. → **СЫН**
МІНІСТРАНТ: ХРЫСЦЕ, ЗМІЛУЙСЯ.
СВЯТАР: ПАНЕ, ЗМІЛУЙСЯ.
МІНІСТРАНТ: ПАНЕ, ЗМІЛУЙСЯ. → **СВЯТЫ ДУХ**
СВЯТАР: ПАНЕ, ЗМІЛУЙСЯ.

МЫ ТРОЙЧЫ ПРОСІМ КОЖНУЮ АСОБУ СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ ПРАБАЧЫЦЬ НАМ ГРАХІ.

GLORIA ПРАМАЎЛЯЕЦЦА ТОЛЬКІ Ў РАДАСНЫЯ СВЯТЫ.

...А НА ЗЯМЛІ СУПАКОЙ ЛЮДЗЯМ ДОБРАЙ ВОЛІ. ХВАЛІМ ЦЯБЕ, БЛАГАСЛАЎЛЯЕМ ЦЯБЕ, КЛАНЯЕМСЯ ТАБЕ, ПРАСЛАЎЛЯЕМ ЦЯБЕ, ДЗЯКУЕМ ТАБЕ ДЗЕЛЯ ВЯЛІКАЙ ХВАЛЫ ТВАЁЙ. ПАНЕ БОЖА, ВАЛАДАРУ НЯБЕСНЫ, БОЖА, ОЙЧА ЎСЕМАГУТНЫ. } **АЙЦЕЦ**

ПАНЕ, СЫНЕ АДЗІНАРОДНЫ, ЕЗУ ХРЫСЦЕ, ПАНЕ БОЖА, ЯГНЯ БОЖАЕ, СЫНЕ АЙЦА, ЯКІ БЯРЭШ НА СЯБЕ ГРАХІ СВЕТУ, ЗМІЛУЙСЯ НАД НАМІ. ЯКІ БЯРЭШ НА СЯБЕ ГРАХІ СВЕТУ, ПРЫМІ МАЛЕННЕ НАШАЕ. ЯКІ СЯДЗІШПРАВАРУЧ АЙЦА, ЗМІЛУЙСЯ НАД НАМІ. БО ТОЛЬКІ ТЫ СВЯТЫ, ТОЛЬКІ ТЫ НАШ ПАН, ТОЛЬКІ ТЫ НАЙВЫШЭЙШЫ, ЕЗУ ХРЫСЦЕ... } **СЫН**

GLORIA СА СВАІМ ПАКЛАНЕННЕМ І ПАДЗЯКАЙ ТАКСАМА СКІРАВАНА ДА ТРОХ АСОБАЎ ТРОЙЦЫ.

...З ДУХАМ СВЯТЫМ У ХВАЛЕ БОГА АЙЦА. АМЭН. } **СВЯТЫ ДУХ**

ПАСЛЯ GLORIA СВЯТАР ЦАЛУЕ ЦЭНТР АЛТАРА. ЗАТЫМ, ПАВЯРНУЎШЫСЯ ДА ВЕРНІКАЎ, ВІТАЕ ІХ.

ЁН РОБІЦЬ ТАК КОЖНЫ РАЗ, КАЛІ ХОЧА ЗВЯРНУЦЬ ІХНЮЮ ЎВАГУ НА АСАБЛІВУЮ ЧАСТКУ ІМШЫ.

ВЯРНУЎШЫСЯ НА БОК ПАСЛАННЯ, СВЯТАР РОБІЦЬ ПАКЛОН КРЫЖУ І КАЖА: "МОЛІМСЯ".

ГЭТЫМ РАЗАМ АСАБЛІВАЕ ДЗЕЯННЕ — ГЭТА КАЛЕКТЫ, АБО МАЛІТВЫ-ПРОСЬБЫ.

СВЯТАР МОЛІЦЦА З РАЗВЕДЗЕНЫМІ РУКАМІ, ЯК МАЛІЎСЯ МАЙСЕЙ, КАЛІ ПРАСІЎ У БОГА ДЛЯ ІЗРАІЛЬЦЯНАЎ ДАПАМОГІ Ў БІТВЕ.

У КОЖНАЙ КАЛЕКЦЕ МЫ ПРОСІМ ДАПАМОГІ Ў БОГА АЙЦА ПРАЗ СЫНА — ЗНОЎ У ЕДНАСЦІ З ТРЫМА БОСКІМІ АСОБАМІ!

НЕКАТОРЫЯ ІМШЫ МАЮЦЬ ТОЛЬКІ АДНУ КАЛЕКТУ. НЕКАТОРЫЯ МАЮЦЬ НЕКАЛЬКІ. КАЛЕКТЫ ЗМЯНЯЮЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ІМШЫ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ПЯТАЯ: СЛУХАЕМ БОГА

ЦЯПЕР, КАЛІ МЫ ПАРАЗМАЎЛЯЛІ З БОГАМ, ЁН РАЗМАЎЛЯЕ З НАМІ. ЗВЯРНІ ЎВАГУ, ШТО ТУТ ТАКСАМА ПРАДСТАЎЛЕНА ТРОЙЦА.



ПАСЛАННЕ ЧЫТАЕЦЦА АДРАЗУ ПАСЛЯ КАЛЕКТАЎ.

ЦЯПЕР МОЖАШ СЕСЦІ.

О ГЛЫБІНЯ БАГАЦЦЯ, І МУДРАСЦІ, І ПАЗНАННЯ БОГА! ЯКІЯ НЕСПАСЦІГАЛЬНЫЯ ПРЫСУДЫ ЯГО І НЯЗВЕДАНЫЯ ШЛЯХІ ЯГОНЫЯ! БО ХТО СПАЗНАЎ РОЗУМ ПАНА? АБО ХТО БЫЎ ДАРАДЦАМ ЯГОНЫМ? АБО ХТО ДАЎ ЯМУ РАНЕЙ, КАБ АТРЫМАЦЬ АДПЛАТУ? БО З ЯГО, І ПРАЗ ЯГО, І ДЛЯ ЯГО ЎСЁ. ЯМУ ХВАЛА НАВЕКІ. АМЭН.

НАЙЧАСЦЕЙ ЧЫТАЕЦЦА ЎРЫВАК З ПАСЛАННЯЎ СВЯТОГА ПАЎЛА, АЛЕ ЧАСАМ ЁН ВЫБІРАЕЦЦА З ДЗЕЯЎ АПОСТАЛАЎ, АПАКАЛІПСІСА СВЯТОГА ЯНА, ПАСЛАННЯЎ ІНШЫХ АПОСТАЛАЎ АБО СА СТАРОГА ЗАПАВЕТУ.

ПАСЛАННЕ ВЫБІРАЕЦЦА ЗГОДНА СА СВЯТАМ ЦІ ІНШАЙ НАГОДАЙ.

ХОЦЬ НА ІМШЫ МОЖА БЫЦЬ БОЛЬШ ЗА АДНО ПАСЛАННЕ, ГЭТА ЗДАРАЕЦЦА ТОЛЬКІ НЕКАЛЬКІ РАЗОЎ НА ГОД.

КАЛІ ЧЫТАННЕ СКОНЧАНА, СВЯТАР ПАДАЕ МІНІСТРАНТУ ЗНАК ЛЕВАЙ РУКОЙ, А ТОЙ ДЗЯКУЕ БОГУ ЗА АТРЫМАНАЕ НАСТАЎЛЕННЕ.

ПАКУЛЬ МІНІСТРАНТ ПАДЫХОДЗІЦЬ, КАБ УЗЯЦЬ ІМШАЛ, СВЯТАР ЧЫТАЕ НЕКАЛЬКІ КАРОТКІХ МАЛІТВАЎ.

ГЭТЫЯ МАЛІТВЫ ВЫКАЗВАЮЦЬ НАШУЮ РАДАСЦЬ З ТАГО, ШТО ХРЫСТУС ВУЧЫЦЬ НАС. АДПАВЕДНА, НА СПЯВАНАЙ ІМШЫ ГЭТЫЯ МАЛІТВЫ СПЯВАЮЦЦА.

ЯК І ПАСЛАННЕ, ГЭТЫЯ МАЛІТВЫ ЗМЯНЯЮЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ІМШЫ.

АЛЛЕЛЮЯ, АЛЛЕЛЮЯ. БЛАГАСЛАЎЛЁНЫ ТЫ, ПАНЕ, БОЖА АЙЦОЎ НАШЫХ, ПОЎНЫ ХВАЛЫ І ЎЗВЯЛІЧАНЫ НАВЕКІ.

ГЭТА НАСТУПНЫЯ МАЛІТВЫ:

ГРАДУАЛ: ЁН ТАК ЗАВЕЦЦА ТАМУ, ШТО Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ КАНТАРЫ ПАДЧАС СПЕВУ СТАЯЛІ НА ПРЫСТУПКАХ АЛТАРА.

АЛЛЕЛЮЯ: ВЕЛЬМІ КАРОТКІ СПЕЎ ХВАЛЫ. "АЛЛЕЛЮЯ" — ГЭТА ГАБРЭЙСКАЕ СЛОВА, ЯКОЕ АЗНАЧАЕ "ХВАЛІЦЕ БОГА".

ТРАКТ: ДАЎЖЭЙШАЯ І МЕНШ РАДАСНАЯ МАЛІТВА, ЯКАЯ ЗАМЯНЯЕ "АЛЛЕЛЮЯ" Ў СМУТНЫЯ І ПАКАЯННЫЯ ПЕРЫЯДЫ.

У НЕКАТОРЫЯ СВЯТЫ ДА "АЛЛЕЛЮЯ" ЦІ ДА ТРАКТА ДАДАЕЦЦА ДОЎГІ ТВОР, ЯКІ ЗАВЕЦЦА СЕКВЕНЦЫЯЙ.

ПАСЛЯ ГЭТЫХ МАЛІТВАЎ ІМШАЛ ПЕРАНОСЯЦЬ НА ІНШЫ БОК АЛТАРА, І СВЯТАР ЧЫТАЕ АДМЫСЛОВУЮ МАЛІТВУ, ПРОСЯЧЫ БОГА ДАПАМАГЧЫ ЯМУ ГОДНА ПРАЧЫТАЦЬ ЕВАНГЕЛЛЕ.

СЛУХАЙ ЕВАНГЕЛЛЕ СТОЯЧЫ.

МЫ СТАІМ ПАДЧАС ЕВАНГЕЛЛЯ З ПАВАГІ ДА СЛОВАЎ ХРЫСТА.

ЕВАНГЕЛЛЕ ЧЫТАЕЦЦА НА ПРАВЫМ БАКУ АЛТАРА (НА ЛЕВЫМ, КАЛІ ГЛЯДЗЕЦЬ АД НАС). ПРАВЫ БОК — ГЭТА ШАНАВАНАЕ МЕСЦА.

ПЕРАД ПАЧАТКАМ ЕВАНГЕЛЛЯ СВЯТАР РОБІЦЬ ЗНАК КРЫЖА НА ЧАЛЕ, ВУСНАХ І ГРУДЗЯХ. ЗРАБІ ТОЕ САМАЕ:

ЕВАНГЕЛЛЕ ЧЫТАЕЦЦА СА ЗВЕДЗЕНЫМІ РУКАМІ. ТЫ ТАКСАМА ЗВЯДЗІ ДАЛОНІ.

УРЫВАК ЗАЎСЁДЫ БЯРЭЦЦА Ў АДНАГО З ЧАТЫРОХ ЕВАНГЕЛІСТАЎ: МАЦВЕЯ, МАРКА, ЛУКІ АБО ЯНА. ЕВАНГЕЛЛЕ ТАКСАМА ЗМЯНЯЕЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ІМШЫ ЦІ СВЯТА.

ПАСЛЯ ЧЫТАННЯ СВЯТАР З ПАШАНАЙ ЦАЛУЕ КНІГУ.

У НЯДЗЕЛЮ ПАСЛЯ ЕВАН-ГЕЛЛЯ СВЯТАР ЗАЗВЫЧАЙ ПРАМАЎЛЯЕ ГАМІЛІЮ ЦІ НАСТАЎЛЕННЕ.

ГАМІЛІЯ — ГЭТА ВАЖНАЯ ЧАСТКА ІМШЫ. ЯНА — ВАЖНЫ СРОДАК, ПРАЗ ЯКІ БОГ РАЗМАЎЛЯЕ З НАМІ.

ПЕРАД ГАМІЛІЯЙ СВЯТАР ЗНОЎ ЧЫТАЕ ЕВАНГЕЛЛЕ НА РОДНАЙ МОВЕ.

ЦЯПЕР СЯДЗЬ.

ПАДЧАС ГАМІЛІІ ПАВОДЗЬ СЯБЕ ЦІХА І ЎВАЖЛІВА СЛУХАЙ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ШОСТАЯ: ПАРОЛЬ

У НЯДЗЕЛІ І ВАЖНЫЯ СВЯТЫ СВЯТАР, ВЯРНУЎШЫСЯ ДА АЛТАРА, ЧЫТАЕ НІКЕЙСКІ СІМВАЛ ВЕРЫ.
СІМВАЛ ВЕРЫ ЎТРЫМЛІВАЕ ГАЛОЎНЫЯ ПРАЎДЫ, У ЯКІЯ ПАВІНЕН ВЕРЫЦЬ КАТАЛІК. ЁН З'ЯЎЛЯЕЦЦА АКТАМ ВЕРЫ Ў ТЫЯ РЭЧЫ, ПРА ЯКІЯ МЫ ДАВЕДАЛІСЯ Ў ПАСЛАННІ, ЕВАНГЕЛЛІ І КАЗАННІ.
ТАМУ ГЭТА ЦУДОЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ІМШЫ ВЕРНІКАЎ. ГЭТА БЫЦЦАМ ПАРОЛЬ, ЯКІ ДАЗВАЛЯЕ НАМ ПРЫСТУПІЦЬ ДА ВЯЛІКАЙ ТАЯМНІЦЫ ІМШЫ.
ІМША ВЕРНІКАЎ — ГЭТА ІМША ТЫХ, ХТО ВЕРЫЦЬ.
ВЕРЫЦЬ У ШТО?

ВА ЎСЁ, ПРА ШТО СКАЗАНА Ў СІМВАЛЕ ВЕРЫ.

ПАДЧАС СЛОВАЎ, ЯКІЯ ПРЫПАМІНАЮЦЬ НАМ МОМАНТ, КАЛІ ЕЗУС СТАЎ ЧАЛАВЕКАМ, МЫ СХІЛЯЕМ КАЛЕНА Ў ПАКЛАНЕННІ. (НА СПЯВАНАЙ ІМШЫ, КАЛІ СІМВАЛ ВЕРЫ СПЯВАЕЦЦА, МЫ СТАНОВІМСЯ НА КАЛЕНІ.)

ЗВЯРНІ ЎВАГУ НА ТОЕ, ШТО СІМВАЛ ВЕРЫ ПАДЗЕЛЕНЫ НА ТРЫ ЧАСТКІ, ЯКІЯ АДНОСЯЦЦА ДА НАШАЙ ВЕРЫ Ў ТРОХ АСОБАЎ ТРОЙЦЫ, А ТАКСАМА Ў ВУЧЭННЕ КАСЦЁЛА: ХРОСТ, УВАСКРАШЭННЕ ПАМЕРЛЫХ І ВЕЧНАЕ ЖЫЦЦЁ.

ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ СІМВАЛА ВЕРЫ (АБО АДРАЗУ ПАСЛЯ ЕВАНГЕЛЛЯ НА ІМШАХ, ДЗЕ СІМВАЛА ВЕРЫ НЯМА) МЫ ПЕРАЙШЛІ МОСТ, ЯКІ ВЯДЗЕ АД ІМШЫ КАТЭХУМЭНАЎ ДА ІМШЫ ВЕРНІКАЎ.

ІМША ВЕРНІКАЎ ПАЧЫНАЕЦЦА З ТАГО, ШТО СВЯТАР ЗВЫЧАЙНЫМ ЧЫНАМ ЗАКЛІКАЕ ЛЮД ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ.

ЦЯПЕР МОЖАШ СЕСЦІ.

У РАННІЯ ЧАСЫ КАСЦЁЛА ЎСЕ ПУБЛІЧНЫЯ ГРЭШНІКІ І ТЫЯ, ХТО НЕ З'ЯЎЛЯЎСЯ КАТАЛІКОМ, У ГЭТЫ МОМАНТ МУСІЛІ ВЫЙСЦІ З КАСЦЁЛА.

ВОСЬ ІМША ВЕРНІКАЎ
У ВЫГЛЯДЗЕ ДЫЯГРАМЫ:



ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА СЁМАЯ: МЫ ПРЫНОСІМ ДАРЫ

АД АФЕРТОРЫЯ ДА САКРЭТЫ МЫ РЫХТУЕМСЯ ДА ВЯЛІКАГА АХВЯРАПРЫНАШЭННЯ:

1. ПРАЗ ПАДРЫХТОЎКУ ДАРОЎ
2. ПРЫЗНАННЕ НАШАЙ НЯГОДНАСЦІ
3. ПРОСЬБУ АБ ДАПАМОЗЕ



РАНЕЙ АФЕРТОРЫЙ ПАЧЫНАЎСЯ ПРАЦЭСІЯЙ, ПАДЧАС ЯКОЙ ВЕРНІКІ СПЯВАЛІ АДМЫСЛОВЫ ПСАЛЬМ І ПРЫНОСІЛІ ДА АЛТАРА ДАРЫ.



СЁННЯ ГЭТАЙ ПРАЦЭСІІ БОЛЬШ НЯМА, ТАМУ СВЯТАР ЧЫТАЕ ТОЛЬКІ КАРОТКУЮ МАЛІТВУ ЦІ ВЕРШ З ПСАЛЬМА. ЁН ЗАВЕЦЦА АНТЫФОНАЙ АФЕРТОРЫЯ.

АНТЫФОНА АФЕРТОРЫЯ ЗМЯНЯЕЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД СВЯТА. НА СПЯВАНАЙ ІМШЫ ЯЕ ВЫКОНВАЕ ХОР.

У МНОГІХ КАСЦЁЛАХ, КАЛІ СВЯТАР АДКРЫВАЕ КЕЛІХ, ЗВОНІЦЬ ЗВАНОЧАК, КАБ НАГАДАЦЬ ВЕРНІКАМ ПРА ТОЕ, ШТО ПАЧЫНАЕЦЦА САМАЯ ВАЖНАЯ ЧАСТКА ІМШЫ.



ПАКІДАЮЧЫ КЕЛІХ УБАКУ, СВЯТАР СПАЧАТКУ АХВЯРУЕ ХЛЕБ.

ХЛЕБ СІМВАЛІЗУЕ ЎСІХ НАС, ЯКІЯ ПАДЧАС ІМШЫ ЗЛУЧАЕМСЯ Ў ХРЫСЦЕ.

ЯК

ШМАТЛІКІЯ ЗЯРНЯТЫ...

ЯДНАЮЦЦА

Ў АДНЫМ КАВАЛКУ ХЛЕБА,

ТАК

МНОСТВА РОЗНЫХ ЛЮДЗЕЙ

ПРАЗ ЛЮБОЎ ХРЫСТА ЯДНАЕЦЦА

Ў АДНЫМ КАСЦЁЛЕ.

ТАКСАМА ХЛЕБ СІМВАЛІЗУЕ ХРЫСТА.

ХЛЕБ = ЕЖА = ЖЫЦЦЁ

ХРЫСТУС = ЭЎХАРЫСТЫЯ = ДУХОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ



КАЛІ МЫ АХВЯРУЕМ ГОСТЫЮ СА СВЯТАРОМ, МЫ ЧАКАЕМ АХВЯРАВАННЯ ЕЗУСА ХРЫСТА, БО ПАДЧАС КАНСЭКРАЦЫІ ХЛЕБ СТАНЕ ЦЕЛАМ ХРЫСТА.

КАЛІ СВЯТАР ПЛАНУЕ КАНСЭКРАВАЦЬ ГОСТЫІ ДЛЯ ВЕРНІКАЎ (КАЛІ ІХ НЕДАСТАТКОВА Ў ТАБЕРНАКУЛЮМЕ), НА КАРПАРАЛ СТАВІЦЦА ЦЫБОРЫЙ З ГОСТЫЯМІ. ЦЫБОРЫЙ НАКРЫТЫ НАКРЫЎКАЙ ЗАЎСЁДЫ, АКРАМЯ МОМАНТАЎ, КАЛІ:

1) СВЯТАР АХВЯРУЕ ГОСТЫЮ;
2) СВЯТАР КАНСЭКРУЕ ГОСТЫЮ.

ЦЯПЕР СВЯТАР АХВЯРУЕ ГОСТЫЮ НА ПАТЭНЕ І ГОСТЫІ Ў ЦЫБОРЫІ ЯК АДНО ЦЭЛАЕ.



АХВЯРАВАЎШЫ ГОСТЫЮ, СВЯТАР АДКЛАДАЕ ПАТЭНУ ЎБОК І БЯРЭ КЕЛІХ, ВЫЦІРАЮЧЫ ЯГО ПУРЫФІКАТАРАМ. ЗАТЫМ ЁН НАЛІВАЕ Ў КЕЛІХ ВІНО І ДАДАЕ АДНУ ЦІ ДЗВЕ КРОПЛІ ВАДЫ.

ВІНО СІМВАЛІЗУЕ ХРЫСТА. (ЯНО НАСАМРЭЧ СТАНЕЦЦА КРЫВЁЮ ХРЫСТА ПАДЧАС КАНСЭКРАЦЫІ.)

ВАДА СІМВАЛІЗУЕ НАС САМІХ.
(МЫ ЗГУБІМСЯ Ў КРЫВІ ХРЫСТА
ПАДЧАС КАНСЭКРАЦЫІ,
ЯК ТОЛЬКІ ШТО ВАДА
ЗГУБІЛАСЯ Ў ВІНЕ.)

ТАКІМ ЧЫНАМ, МЫ ЯДНАЕМСЯ
Ў ХРЫСЦЕ (“САЎДЗЕЛЬНІЧАЕМ
У ЯГОНАЙ БОСКАСЦІ”).

І ТАМУ РАЗАМ З ХРЫСТОМ МЫ
АХВЯРУЕМ СЯБЕ ПАДЧАС ІМШЫ.

КАЛІ БОГ АЙЦЕЦ ПРЫМАЕ
АХВЯРУ СВАЙГО СЫНА ПАДЧАС
ІМШЫ, ЁН ПРЫМАЕ І НАС.
ЁН ПРАБАЧАЕ НАМ НАШЫЯ
ГРАХІ, НАШУЮ СЛАБАСЦЬ
І НАШЫЯ ПАМЫЛКІ,
ТАМУ ШТО ЁН ЛЮБІЦЬ ХРЫСТА —
І НАС РАЗАМ З ІМ.

ДАКЛАДНА ЯК ХЛЕБ, СВЯТАР АХВЯРУЕ І ВІНО.

АФЕРТОРЫЙ — АДНА З ВАЖНЫХ ЧАСТАК ІМШЫ.

КАЛІ ТЫ ПРАПУСЦІЎ ЯГО, ТАБЕ ТРЭБА ПРЫСУТНІЧАЦЬ НА ІНШАЙ ІМШЫ, КАБ ВЫКАНАЦЬ АБАВЯЗАК УДЗЕЛУ Ў ІМШЫ Ў НЯДЗЕЛЮ І АБАВЯЗКОВЫЯ СВЯТЫ.

СТАВЯЧЫ КЕЛІХ НА АЛТАР, СВЯТАР РОБІЦЬ ІМ ЗНАК КРЫЖА НАД ЦЭНТРАМ КАРПАРАЛА.

ЗАТЫМ ЁН НАКРЫВАЕ КЕЛІХ ПАЛАЙ.

КЕЛІХ НАКРЫВАЮЦЬ, КАБ НІЧОГА ВЫПАДКОВА НЕ ТРАПІЛА Ў ЯГО.

ПРАМОВІЎШЫ МАЛІТВЫ АХВЯРАВАННЯ, СВЯТАР ПРОСІЦЬ БОГА АЧЫСЦІЦЬ ЯГО:

1. ЁН МОЛІЦЦА АБ ПАКОРЫ І РАСКАЯННІ, ЯКІЯ НЕАБХОДНЫЯ ДЛЯ НАШАГА АЧЫШЧЭННЯ АД МІНУЛЫХ ГРАХОЎ.

2. ЁН ТАКСАМА ПРОСІЦЬ БОГА БЛАГАСЛАВІЦЬ НАШУЮ АХВЯРУ, КАБ ЯНА ТАКСАМА СТАЛА ЧЫСТАЙ.

3. ЁН АБМЫВАЕ РУКІ НА ЗНАК ЧЫСЦІНІ.

ПАДЧАС ГЭТЫХ МАЛІТВАЎ МЫ ПАВІННЫ ПРАСІЦЬ БОГА, КАБ ЁН ДАПАМОГ НАМ БЫЦЬ УВАЖЛІВЫМІ І АЧЫСЦІЎ НАС АД УСЯГО, ШТО АДДАЛЯЕ НАС АД ХРЫСТА.

НА ЎРАЧЫСТАЙ ІМШЫ ПЕРАД АБМЫВАННЕМ РУК СВЯТАР КАДЗІЦЬ АЛТАР.

АБМЫЦЦЁ РУК — ГЭТА СТАРАЖЫТНЫ СІМВАЛ АЧЫШЧЭННЯ ДУШЫ.

У СТАРАЖЫТНЫЯ ЧАСЫ ЯНО БЫЛО НЕАБХОДНЫМ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК СВЯТАР ДАКРАНАЎСЯ ДА РОЗНЫХ ДАРОЎ, ЯКІЯ ЛЮДЗІ ПРЫНОСІЛІ ДА АЛТАРА.

МАЛІТВА, ЯКУЮ СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ПАДЧАС АБМЫВАННЯ РУК, УЗЯТАЯ З КНІГІ ПСАЛЬМАЎ.

ВЯРТАЮЧЫ РУЧНІК МІНІСТРАНТУ, СВЯТАР РОБІЦЬ ПАКЛОН І ПРАМАЎЛЯЕ “ХВАЛА АЙЦУ...”

ТРЭЦІ КРОК ДА КАНОНА СКЛАДАЕЦЦА З ТРОХ МАЛІТВАЎ, У ЯКІХ МЫ ПРОСІМ БОГА ДАПАМАГЧЫ НАМ ГОДНА ПРЫНЕСЦІ АХВЯРУ.

ПАКУЛЬ СВЯТАР ЧЫТАЕ ПЕРШУЮ З ГЭТЫХ МАЛІТВАЎ, ПАДУМАЙ, ЯК ПАДЧАС ІМШЫ ХРЫСТУС АДНАЧАСОВА І ПРЫНОСІЦЬ АХВЯРУ ІМШЫ, І САМ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТЫМ, КАГО ПРЫНОСЯЦЬ У АХВЯРУ.

СВЯТАР ПРОСІЦЬ ВЕРНІКАЎ ДАЛУЧЫЦЦА ДА ЯГО Ў СКЛАДАННІ БОГУ НАШАЙ АХВЯРЫ.

ЗВЯРНІ ЎВАГУ, ШТО СВЯТАР КАЖА: “МАЯ І ВАШАЯ АХВЯРА“.

МЫ МОЖАМ ДУХОЎНА ДАЛУЧАЦЦА ДА ДУХУ ТРОХ АПОШНІХ МАЛІТВАЎ ПЕРАД КАНОНАМ, ПАЎТАРАЮЧЫ ЗА МІНІСТРАНТАМ ГЭТУЮ МАЛІТВУ І ЎСВЕДАМЛЯЮЧЫ, ШТО МЫ КАЖАМ:

САКРЭТЫ — ГЭТА АДНА ЦІ БОЛЬШ МАЛІТВАЎ, ЯКІЯ СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ЦІХІМ ГОЛАСАМ (АДСЮЛЬ ІХ НАЗВА). ЯНЫ НАГАДВАЮЦЬ КАЛЕКТЫ І ЗМЯНЯЮЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД СВЯТА.

АПОШНІЯ СЛОВЫ АПОШНЯЙ САКРЭТЫ (ТУТ ЯНЫ ПАДКРЭСЛЕНЫЯ) ПРАМАЎЛЯЮЦЦА ЎСЛЫХ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ВОСЬМАЯ: СВЯТАЯ СВЯТЫХ

ЦЯПЕР МЫ ПАДЫШЛІ ДА ЦЭНТРА ІМШЫ — ДА КАНОНА (ЁН НАЗВАНЫ КАНОНАМ, ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ ЗАКОНАМ, ТАМУ ШТО ЁН, ЯК І ЗАКОН, ЗАСТАЕЦЦА НЯЗМЕННЫМ).

МЫ МОЖАМ ПРАДСТАВІЦЬ МАЛІТВЫ КАНОНА ЯК АЛТАР ДЛЯ КАНСЭКРАЦЫІ, ЯКІ СКЛАДАЕЦЦА З ТРОХ КАЛОН, ШТО СТАЯЦЬ НА ШАСЦІ ПРЫСТУПКАХ. МЫ ПАДЫМАЕМСЯ ДА АЛТАРА З АДНАГО БОКУ, А СПУСКАЕМСЯ З ІНШАГА.



ПАМЯТАЙ ПРА ГЭТУЮ ДЫЯГРАМУ, КАЛІ МЫ БУДЗЕМ РАЗГЛЯДАЦЬ КАНОН. У КОЖНАЙ МАЛІТВЫ БУДЗЕ СВОЙ НУМАР, ЯКІ АДПАВЯДАЕ НУМАРУ НА ГЭТАЙ ДЫЯГРАМЕ.

У МОМАНТ, КАЛІ СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ПРЫВІТАННЕ, ЯКОЕ ЗАЗВЫЧАЙ ПАКАЗВАЕ НА НЕШТА ВАЖНАЕ, ЗАКАНЧВАЕЦЦА АФЕРТОРЫЙ І ПАЧЫНАЕЦЦА КАНОН.

КАНОН, ЯК І ІНШЫЯ ЧАСТКІ ІМШЫ, ПАЧЫНАЕЦЦА І ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПРЫСВЯЧЭННЕМ ТРОЙЦЫ.

ПРЭФАЦЫЯ — ГЭТА ПРЫСВЯЧЭННЕ ТРОЙЦЫ Ў ПАЧАТКУ КАНОНА. ГЭТА ТАКСАМА МАЛІТВА ПАДЗЯКІ. МЫ ДЗЯКУЕМ БОГУ ЗА МАГЧЫМАСЦЬ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ІМШЫ.

(1) СВЯТАР ЧЫТАЕ ПРЭФАЦЫЮ З ІМШАЛА:

САПРАЎДЫ, ГОДНА ГЭТА І СПРАВЯДЛІВА, СЛУШНА І ЗБАВЕННА, КАБ МЫ ЗАЎСЁДЫ І ЎСЮДЫ ТАБЕ СКЛАДАЛІ ПАДЗЯКУ, ПАНЕ, СВЯТЫ ОЙЧА, УСЕМАГУТНЫ, ВЕЧНЫ БОЖА. ТЫ З АДЗІНАРОДНЫМ ТВАІМ СЫНАМ І ДУХАМ СВЯТЫМ АДЗІНЫ БОГ, АДЗІНЫ ПАН; НЕ ПРАЗ АДЗІНСТВА АСОБЫ, АЛЕ ПРАЗ АДЗІНСТВА СУТНАСЦІ АСОБАЎ ТРОЙЦЫ. А ТОЕ, У ШТО МЫ, ДЗЯКУЮЧЫ ТВАЙМУ АДКРЫЦЦЮ, ВЕРЫМ АБ ТВАЁЙ СЛАВЕ, БЕЗ АДРОЗНЕННЯ ВЫЗНАЁМ ТАКСАМА АБ ТВАІМ СЫНЕ І АБ ДУХУ СВЯТЫМ. ТАКІМ ЧЫНАМ, ВЫЗНАЮЧЫ САПРАЎДНАЕ І ВЕЧНАЕ БОСТВА, МЫ ЎШАНОЎВАЕМ ТРЫ БОЖЫЯ АСОБЫ АДНОЙ СУТНАСЦІ І РОЎНАЙ ВЕЛІЧЫ. ГЭТУЮ ВЕЛІЧ ПРАСЛАЎЛЯЮЦЬ УСЕ АНЁЛЫ І АРХАНЁЛЫ, ХЕРУВІМЫ І СЕРАФІМЫ, ЯКІЯ НЕ ПЕРАСТАЮЦЬ ШТОДЗЁННА ПАЎТАРАЦЬ, У АДЗІН ГОЛАС УСКЛІКАЮЧЫ:

СЛОВА "ЭЎХАРЫСТЫЯ" АЗНАЧАЕ ПАДЗЯКУ. УДЗЕЛ У ІМШЫ І ПРЫНЯЦЦЕ СВЯТОЙ КАМУНІІ — ГЭТА АДЗІН З НАЙЛЕПШЫХ СПОСАБАЎ ПАДЗЯКАВАЦЬ БОГУ ЗА ШТОСЬЦІ. КОЖНАМУ З НАС ЁСЦЬ ЗА ШТО ПАДЗЯКАВАЦЬ БОГУ. ГЭТА:

НАШЫЯ БАЦЬКІ

НАШ ДОМ

НАШЫЯ СЯБРЫ

НАША ШКОЛА

НАШ КАСЦЁЛ

ІМША

ЦЯПЕР СТАНЬ НА КАЛЕНІ.

SANCTUS (ЛАЦ. СВЯТЫ) — ГЭТА МАЛІТВА АНЁЛАЎ, ЯКІЯ ПАКЛАНЯЮЦЦА БОГУ.

МЫ ДАЛУЧАЕМСЯ ДА ГЭТАЙ МАЛІТВЫ. МІНІСТРАНТ ЗВОНІЦЬ У ЗВАНОЧАК, І МЫ СТАНОВІМСЯ НА КАЛЕНІ.

МЫ ЎВАХОДЗІМ У СВЯТУЮ СВЯТЫХ ІМШЫ.

(2) СВЯТАР ПАЧЫНАЕ МАЛІТВУ TE IGITUR:

ПАЦАЛАВАЎШЫ АЛТАР, ЁН КАЖА:

У ЧАСЫ СТАРОГА ЗАПАВЕТУ САМЫМ СВЯТЫМ МЕСЦАМ Ў ХРАМЕ БЫЛА СВЯТАЯ СВЯТЫХ. У ГЭТЫ ПАКОЙ МОГ УВАХОДЗІЦЬ ТОЛЬКІ ПЕРШАСВЯТАР.

ТАМ ЗАХОЎВАЎСЯ КАЎЧЭГ ЗАПАВЕТУ.

КАНОН ЯШЧЭ БОЛЬШ СВЯТЫ ЗА СВЯТУЮ СВЯТЫХ, АДНАК БОГ ДАЗВАЛЯЕ ЎСІМ НАМ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ІМ.

СВЯТАР ТРОЙЧЫ РОБІЦЬ ЗНАК КРЫЖА НАД ДАРАМІ І ПРОСІЦЬ БОГА ПРЫНЯЦЬ АХВЯРУ, ЯКУЮ БУДЗЕ СКЛАДАЦЬ.

ЦЯПЕР СВЯТАР ЦІХІМ ГОЛАСАМ ПРАМАЎЛЯЕ ПЕРШУЮ МАЛІТВУ ЎСПАМІНУ.

УСЯГО ТАКІХ МАЛІТВАЎ ШЭСЦЬ: ТРЫ ПЕРАД КАНСЭКРАЦЫЯЙ І ТРЫ ПАСЛЯ ЯЕ.

У ПЕРШАЙ МАЛІТВЕ ЎСПАМІНУ ЗГАДВАЕЦЦА КАСЦЁЛ І ЎСЕ ЯГО ЧЛЕНЫ.

3

У ДРУГОЙ МАЛІТВЕ ЎСПАМІНУ ЗГАДВАЮЦЦА НАШЫЯ СЯБРЫ, ПРЫСУТНЫЯ Ў КАСЦЁЛЕ, І ЎСЕ, ЗА КАГО МЫ ХОЧАМ ПАМАЛІЦЦА.

У ПАЧАТКУ ГЭТАЙ МАЛІТВЫ СВЯТАР РОБІЦЬ НЕВЯЛІКУЮ ПАЎЗУ, КАБ УЗГАДАЦЬ ТЫХ, ЗА КАГО ЁН САМ ХОЧА ПАМАЛІЦЦА.

НЕ ЗАБУДЗЬ УЗГАДАЦЬ ТЫХ, ЗА КАГО ХОЧАШ ПАМАЛІЦЦА ТЫ!

4



5

У ТРЭЦЯЙ МАЛІТВЕ ЎСПАМІНУ ЗГАДВАЮЦЦА ПРАСЛАЎЛЕНЫЯ СВЯТЫЯ Ў НЕБЕ.

МЫ НАЗЫВАЕМ ПА ІМЁНАХ НАСТУПНЫХ СВЯТЫХ:

БЛАГАСЛАЎЛЁНАЯ ДЗЕВА МАРЫЯ

СВЯТЫ ЮЗАФ

СВЯТЫ ПЁТР І СВЯТЫ ПАВЕЛ

ІНШЫЯ АПОСТАЛЫ

РАННІЯ РЫМСКІЯ ПАПЫ

РЫМСКІЯ МУЧАНІКІ

У КАНОНЕ ЁСЦЬ ПЯЦЬ МАЛІТВАЎ АХВЯРАВАННЯ. ДЗВЕ ПРАМАЎЛЯЮЦЦА ПЕРАД КАНСЭКРАЦЫЯЙ І ДЗВЕ — ПАСЛЯ ЯЕ. АДНА З ІХ, АСАБЛІВАЯ, ПРАМАЎЛЯЕЦЦА РАЗАМ З МАЛІТВАМІ КАНСЭКРАЦЫІ, АДРАЗУ ПАСЛЯ ЎЗНЯСЕННЯ КЕЛІХА.
(ПЕРШАЯ МАЛІТВА АХВЯРАВАННЯ ВЫКАЗВАЕ МЭТУ, З ЯКОЙ МЫ СКЛАДАЕМ АХВЯРУ ІМШЫ.)

6

ДРУГАЯ МАЛІТВА АХВЯРАВАННЯ ВЫКАЗВАЕ СПОСАБ, ЯКІМ МЫ ХОЧАМ СКЛАСЦІ АХВЯРУ.

ПАДЧАС ДРУГОЙ МАЛІТВЫ АХВЯРАВАННЯ СВЯТАР ТРОЙЧЫ БЛАГАСЛАЎЛЯЕ ХЛЕБ І ВІНО. ЗАТЫМ ЁН БЛАГАСЛАЎЛЯЕ ІХ ПААСОБКУ.

ЦЯПЕР МЫ ДАСЯГНУЛІ НАЙВЫШЭЙШАГА ПУНКТУ КАНОНА І СТАІМ ПЕРАД АЛТАРОМ КАНСЭКРАЦЫІ.

ЕЗУС ВОСЬ-ВОСЬ СЫДЗЕ НА АЛТАР.

ХЛЕБ І ВІНО САПРАЎДЫ СТАНУЦЬ ЯГОНЫМ ЦЕЛАМ І КРЫВЁЮ.

БУДЗЬ ВЕЛЬМІ ЎВАЖЛІВЫ.

КАЛІ СВЯТАР ЗБІРАЕЦЦА КАНСЭКРАВАЦЬ ГОСТЫІ ДЛЯ ВЕРНІКАЎ, ЁН ЗДЫМАЕ НАКРЫЎКУ ЦЫБОРЫЯ.
АДНЫМ ДЗЕЯННЕМ ЁН КАНСЭКРУЕ І ГОСТЫЮ Ў СВАІХ РУКАХ, І ГОСТЫІ Ў ЦЫБОРЫІ.

⑦

КАЛІ НАБЛІЖАЕЦЦА КАНСЭКРАЦЫЯ, ДУМАЙ ПРА ТОЕ, ШТО БУДЗЕ АДБЫВАЦЦА.

БОЖАЙ МОЦАЙ, ЯКАЯ ДЗЕЙНІЧАЕ ПРАЗ СЛОВЫ СВЯТАРА, СУБСТАНЦЫІ ХЛЕБА І ВІНА ПЕРАМЕНЯЦЦА Ў ЦЕЛА І КРОЎ ЕЗУСА.

ГЭТАЕ ЗМЯНЕННЕ СУБСТАНЦЫІ З ХЛЕБА Ў ЦЕЛА ХРЫСТА НАЗЫВАЕЦЦА ТРАНССУБСТАНЦЫЯЦЫЯЙ.

ТАКАЯ ЗМЕНА НАЗЫВАЕЦЦА СУБСТАНЦЫЯЛЬНАЙ, ТАМУ ШТО ЗМЯНЯЕЦЦА СУБСТАНЦЫЯ, АЛЕ НЕ ЗМЯНЯЮЦЦА АКЦЫДЭНЦЫІ.

АКЦЫДЭНЦЫІ ЧАГОСЬЦІ — ГЭТА ТОЕ, ШТО МЫ АДЧУВАЕМ, БАЧЫМ, СМАКУЕМ І НЮХАЕМ.

СУБСТАНЦЫЯ — ГЭТА ТОЕ, ЧЫМ ПРАДМЕТ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НАСАМРЭЧ.

СУБСТАНЦЫЯ

ПЕРАД КАНСЭКРАЦЫЯЙ

АКЦЫДЭНЦЫІ

ТЫ МОЖАШ БАЧЫЦЬ АКЦЫДЭНЦЫІ ХЛЕБА, АЛЕ САМ ХЛЕБ — РЭАЛЬНУЮ СУБСТАНЦЫЮ — НЕЛЬГА ЎБАЧЫЦЬ ЦІ ПАСПРАБАВАЦЬ, АКРАМЯ ЯК ПРАЗ АКЦЫДЭНЦЫІ, ДАСТУПНЫЯ НАШЫМ ПАЧУЦЦЯМ.

ПАДЧАС КАНСЭКРАЦЫІ АКЦЫДЭНЦЫІ ХЛЕБА І ВІНА ЗАХОЎВАЮЦЦА, А СУБСТАНЦЫЯ ЗМЯНЯЕЦЦА.

СУБСТАНЦЫЯ ЗМЯНІЛАСЯ

ПАСЛЯ КАНСЭКРАЦЫІ

АКЦЫДЭНЦЫІ ЗАСТАЮЦЦА ТЫМІ Ж

ТЫ НЕ МОЖАШ УБАЧЫЦЬ ЗМЕНЫ, ТАМУ ШТО ЗМЯНІЛАСЯ ТОЛЬКІ СУБСТАНЦЫЯ, А АКЦЫДЭНЦЫІ ЗАСТАЛІСЯ ТЫМІ Ж.

ЦЯПЕР СВЯТАР ДЗЕЙНІЧАЕ АД ІМЯ ХРЫСТА. У ГЭТЫ МОМАНТ ЁН САКРАМЭНТАЛЬНА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ХРЫСТОМ. ТАМУ ЁН КАЖА: "ГЭТА ЦЕЛА МАЁ".

СВЯТАР АДРАЗУ Ж СХІЛЯЕ КАЛЕНА ПЕРАД ХРЫСТОМ У СВАІХ РУКАХ.



ПОТЫМ ЁН ПАДЫМАЕ ЦЕЛА БОЖАГА СЫНА, КАБ УСЕ МАГЛІ ПАКЛАНІЦЦА ЯМУ.

ПАГЛЯДЗІ НА ЕЗУСА Ў ГОСТЫІ І ЦІХА СКАЖЫ ЯМУ: “ПАН МОЙ І БОГ МОЙ!”

АЛЕ КАНСЭКРАЦЫЯ ЯШЧЭ НЕ СКОНЧЫЛАСЯ, ТАМУ ШТО НА КОЖНАЙ ІМШЫ ПАВІННА АДБЫЦЦА ПАДВОЙНАЯ КАНСЭКРАЦЫЯ.



ЧАМУ НА КОЖНАЙ ІМШЫ ПАВІННА БЫЦЬ ПАДВОЙНАЯ КАНСЭКРАЦЫЯ?

ПАДВОЙНАЯ КАНСЭКРАЦЫЯ ПАВІННА АДБЫЦЦА ТАМУ, ШТО МЕНАВІТА ЯНА САКРАМЭНТАЛЬНА ПРАДСТАЎЛЯЕ АХВЯРУ ХРЫСТА НА КРЫЖЫ.

КРЫВАВАЯ АХВЯРА НА ГАЛГОФЕ

АХВЯРА НА КРЫЖЫ ЗДЗЕЙСНІЛАСЯ, КАЛІ КРОЎ <u>ФІЗІЧНА</u> АДДЗЯЛІЛАСЯ АД ЦЕЛА ХРЫСТА.

НЕКРЫВАВАЯ АХВЯРА ІМШЫ

ПАДВОЙНАЯ КАНСЭКРАЦЫЯ

ХЛЕБ І ВІНО КАНСЭКРУЮЦЦА ПААСОБКУ

ПАДЧАС ІМШЫ АХВЯРА СПАЎНЯЕЦЦА, КАЛІ КРОЎ АДДЗЯЛЯЕЦЦА АД ЦЕЛА САКРАМЭНТАЛЬНА.



ПАКОЛЬКІ НАШ ПАН ПРАБЫВАЕ Ў ХВАЛЕ І ЖЫВЕ Ў НЕБЕ, ЯГО ЦЕЛА І КРОЎ БОЛЬШ НЕ РАЗДЗЕЛЕНЫЯ ФІЗІЧНА.

У НАЙСВЯЦЕЙШЫМ САКРАМЭНЦЕ ЁН ТАКІ Ж, ЯК І Ў НЕБЕ, ПРАСЛАЎЛЕНЫ І ЖЫВЫ.

ТАМУ ХРЫСТУС ПРЫСУТНІЧАЕ ЦАЛКАМ — ЦЕЛАМ І КРЫВЁЮ, ДУШОЙ І БОСКАСЦЮ — ЯК ПАД АКЦЫДЭНЦЫЯМІ ХЛЕБА Ў ГОСТЫІ, ТАК І ПАД АКЦЫДЭНЦЫЯМІ ВІНА Ў КЕЛІХУ.

ТАМУ ДАСТАТКОВА ПРЫНЯЦЬ ХРЫСТА ПАД АДНОЙ ПОСТАЦЦЮ (НАПРЫКЛАД, ТОЛЬКІ ПАД ВІДАМ ХЛЕБА). ПРЫ ГЭТЫМ МЫ ПРЫМАЕМ УСЯГО ХРЫСТА.

ХОЦЬ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ АХВЯРЫ ГАЛГОФЫ НЕАБХОДНАЯ ПАДВОЙНАЯ КАНСЭКРАЦЫЯ, ДЛЯ ПРЫНЯЦЦЯ СВЯТОЙ КАМУНІІ ДАСТАТКОВА ТОЛЬКІ АДНОЙ ФОРМЫ ЭЎХАРЫСТЫІ.

КАЛІ СВЯТАР ПАДЫМАЕ КЕЛІХ ДЛЯ ЎШАНАВАННЯ, ПАГЛЯДЗІ НА ЯГО І СКАЖЫ ЕЗУСУ, ЯК МОЦНА ТЫ ЯГО ЛЮБІШ.

ЦЯПЕР СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ТРЭЦЮЮ МАЛІТВУ АХВЯРАВАННЯ, ЯКАЯ НЕПАСРЭДНА ЗВЯЗАНАЯ З КАНСЭКРАЦЫЯЙ.

У ГЭТАЙ МАЛІТВЕ ПЕРАЛІЧВАЮЦЦА ТРЫ ВЯЛІКІЯ ІДЭІ ІМШЫ:

1. УСПАМІН ХРЫСТА

«УСПАМІНАЮЧЫ БЛАГАСЛАЎЛЁНУЮ МУКУ»

2. АХВЯРА ЗА ГРАХІ

«ТВОЙ ЛЮД СВЯТЫ... СКЛАДАЕМ... АХВЯРУ ЧЫСТУЮ»

3. ЭЎХАРЫСТЫЧНАЯ ЕЖА



"ХЛЕБ СВЯТЫ ЖЫЦЦЯ ВЕЧНАГА"

ЧАЦВЁРТАЯ МАЛІТВА АХВЯРАВАННЯ АДПАВЯДАЕ ДРУГОЙ МАЛІТВЕ АХВЯРАВАННЯ (ПЕРАД КАНСЭКРАЦЫЯЙ), ТАМУ ШТО МЫ КАЖАМ БОГУ, ЯК МЫ ХОЧАМ, КАБ ЁН ПРЫНЯЎ ІМШУ.

АХВЯРА АБЭЛЯ

10

АХВЯРА АБРАГАМА

АХВЯРА МЕЛЬХІЗЭДЭКА

МЫ ПРОСІМ НЯБЕСНАГА АЙЦА ПРЫНЯЦЬ НАШУЮ АХВЯРУ, ЯК ЁН ПРЫНЯЎ ПРЫЕМНЫЯ АХВЯРЫ СТАРОГА ЗАПАВЕТУ.

ПЯТАЯ МАЛІТВА АХВЯРАВАННЯ АДПАВЯДАЕ ПЕРШАЙ МАЛІТВЕ АХВЯРАВАННЯ (ПЕРАД КАНСЭКРАЦЫЯЙ), ТАМУ ШТО ЯНА НАЗЫВАЕ ПРЫЧЫНЫ, ПА ЯКІХ МЫ ХОЧАМ, КАБ БОГ ПРЫНЯЎ ІМШУ... КАБ МЫ АТРЫМАЛІ ШЧОДРАЕ НЯБЕСНАЕ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ І ЛАСКУ.

ЗВЯРНІ ЎВАГУ, ШТО ЗНАК КРЫЖА РОБІЦЦА СПАЧАТКУ НАД ЦЕЛАМ І КРЫВЁЮ ЕЗУСА, А ПОТЫМ НАД СВЯТАРОМ, ЯКІ МОЛІЦЦА АД НАШАГА ІМЯ. ТАКІМ ЧЫНАМ, УСЕ МЫ З'ЯДНАНЫЯ З ХРЫСТОМ ПРАЗ КРЫЖ. І ЛАСКА, І БЛАГАСЛАЎЛЕННІ, ЯКІЯ МЫ АТРЫМЛІВАЕМ, ПРЫХОДЗЯЦЬ ДА НАС, ТАМУ ШТО МЫ З'ЯДНАНЫЯ З ЕЗУСАМ.

ТАКСАМА ЗВЯРНІ ЎВАГУ, ЯК ЧАСТА СВЯТАР РОБІЦЬ ЗНАК КРЫЖА. ЁН РОБІЦЬ ЯГО, КАБ ЗНОЎ І ЗНОЎ НАГАДВАЦЬ НАМ ПРА ТОЕ, ШТО ІМША — ГЭТА ЎЗНАЎЛЕННЕ КРЫЖОВАЙ АХВЯРЫ.

ЦЕЛА ХРЫСТА НА КРЫЖЫ.



КРОЎ ХРЫСТА НА КРЫЖЫ.

СВЯТАР І МЫ НА КРЫЖЫ З ХРЫСТОМ.

ЯК ЗНАК КРЫЖА ЯДНАЕ РОЗНЫЯ ЧАСТКІ ІМШЫ, ТАК РОЗНЫЯ ЧАСТКІ БОЖАГА ВАЛАДАРСТВА ЯДНАЮЦЦА ПРАЗ КРЫЖОВУЮ АХВЯРУ. ФАКТЫЧНА МОЖНА АДЛЮСТРАВАЦЬ ІМШУ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ВЯЛІКАГА КРЫЖА, У ЯКІМ ЕЗУС ЯДНАЕ ЎСЕ ЧАСТКІ БОЖАГА ВАЛАДАРСТВА.



ЦЯПЕР МЫ ПЕРАХОДЗІМ ДА ЧАЦВЁРТАЙ МАЛІТВЫ ЎСПАМІНУ. ТУТ МЫ ЗГАДВАЕМ ТЫХ, ХТО ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ЧЫСТЦЫ.

ДУШЫ Ў ЧЫСТЦЫ ЛЮБЯЦЬ БОГА І ХОЧУЦЬ БЫЦЬ З БОГАМ. АЛЕ НА ІХ УСЁ ЯШЧЭ ЁСЦЬ СЛЯДЫ ГРАХОЎ, І ІМ ТРЭБА АЧЫСЦІЦЦА ПЕРАД ТЫМ, ЯК ЯНЫ ЗМОГУЦЬ ТРАПІЦЬ У НЕБА. У ЧЫСТЦЫ ЯНЫ АЧЫШЧАЮЦЦА ПАКУТАМІ І ТВАІМІ МАЛІТВАМІ. ЧЫМ БОЛЬШ ЗА ІХ МОЛЯЦЦА, ТЫМ МЕНШ ІМ ТРЭБА ПАКУТАВАЦЬ.



ДАЛЕЙ ІДЗЕ ПЯТАЯ МАЛІТВА ЎСПАМІНУ. ГЭТАЯ МАЛІТВА — ПРА НАС, ТАМУ ШТО МЫ ГРЭШНІКІ І ПАВІННЫ ЧАСТА МАЛІЦЦА ЗА СЯБЕ.

МЫ ХОЧАМ ТРАПІЦЬ У НЕБА.

ТАМУ МЫ ВЕЛЬМІ МОЦНА МОЛІМСЯ, КАБ ВЫТРЫВАЦЬ У БОЖАЙ ЛЮБОВІ І СЛУЖБЕ.

НАРЭШЦЕ, ІДЗЕ ШОСТАЯ МАЛІТВА ЎСПАМІНУ. ЯНА ВЕЛЬМІ КАРОТКАЯ І ПРОСТА ЎКЛЮЧАЕ Ў СЯБЕ ЎСЁ, ШТО ЁСЦЬ ДОБРАЕ.

СЮДЫ АДНОСЯЦЦА ЯК МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ, ТАК І ДУХОЎНЫЯ РЭЧЫ.



СВЯТАР ЗДЫМАЕ ПАЛУ, ЯКАЯ НАКРЫВАЕ КЕЛІХ, І З ПАШАНАЙ СХІЛЯЕ КАЛЕНА.

15

ЗАТЫМ, УЗЯЎШЫ СВЯТУЮ ГОСТЫЮ, СВЯТАР РОБІЦЬ ЁЮ ТРЫ ЗНАКІ КРЫЖА НАД КЕЛІХАМ І ДВА — ПЕРАД КЕЛІХАМ.

МАЛІТВА, ЯКУЮ ЁН ПРАМАЎЛЯЕ, РОБЯЧЫ ГЭТА, З'ЯЎЛЯЕЦЦА АПОШНЯЙ МАЛІТВАЙ У КАНОНЕ.
ЯНА АДПАВЯДАЕ ПРЭФАЦЫІ, І ГЭТА ТАКСАМА МАЛІТВА ПРАСЛАЎЛЕННЯ НА ЧЭСЦЬ ТРОЙЦЫ.

НАРЭШЦЕ, СВЯТАР ПАДЫМАЕ ГОСТЫЮ І КЕЛІХ РАЗАМ...

...ЯШЧЭ РАЗ АХВЯРУЮЧЫ ІХ БОГУ...

...АЛЕ АХВЯРУЮЧЫ ІХ ТАКСАМА І НАМ...

...БО ЦЯПЕР МЫ ГАТОВЫЯ ПРЫНЯЦЬ ЕЗУСА ПАДЧАС НАШАЙ ВЯЧЭРЫ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ

ЧАСТКА ДЗЯВЯТАЯ: НАШАЯ ВЯЧЭРА

ПАСЛЯ КАНОНА МЫ СХОДЗІМ ПА ПРЫСТУПКАХ ДА КАНЦА ІМШЫ (ГЛ. МАЛЮНАК НА СТАРОНЦЫ 34). ГЭТЫЯ КРОКІ ДЗЕЛЯЦЦА НА ДЗВЕ ЧАСТКІ, ЯК ПАКАЗАНА НІЖЭЙ.



ЦЯПЕР ПАЧЫНАЮЦЦА АБРАДЫ КАМУНІІ. ГЭТА ВЯЧЭРА, НА ЯКОЙ МЫ МОЖАМ ПРЫНЯЦЬ ЦЕЛА І КРОЎ ЕЗУСА ХРЫСТА, КАБ СТАЦЬ МАЦНЕЙШЫМІ ДУХОЎНА. У АФЕРТОРЫІ МЫ СКЛАДАЛІ ЕЗУСА Ў АХВЯРУ БОГУ. У ГЭТАЙ ЧАСТЦЫ ІМШЫ БОГ АХВЯРУЕ ЕЗУСА НАМ.

МЫ ПАЧЫНАЕМ АБРАДЫ КАМУНІІ, ПРАМАЎЛЯЮЧЫ НАЙЛЕПШУЮ МАЛІТВУ З ТЫХ, ШТО МЫ ВЕДАЕМ...

МАЛІТВА ПАНСКАЯ

ГЭТА НАЙЛЕПШАЯ МАЛІТВА, ТАМУ ШТО ЕЗУС САМ НАВУЧЫЎ ЁЙ СВАІХ ВУЧНЯЎ, КАЛІ ЯНЫ СПЫТАЛІСЯ Ў ЯГО, ЯК ТРЭБА МАЛІЦЦА.

ЗВЯРНІ ЎВАГУ, ШТО МЫ ПРОСІМ "ХЛЕБА НАШАГА ШТОДЗЁННАГА". ЕЗУС У НАЙСВЯЦЕЙШЫМ САКРАМЭНЦЕ — ГЭТА ШТОДЗЁННЫ ХЛЕБ ДЛЯ НАШЫХ ДУШАЎ.

ЦЯПЕР СВЯТАР БЯРЭ ПАТЭНУ, ЯКАЯ ЛЯЖАЛА ПАД ПУРЫФІКАТАРАМ СПРАВА АД КАРПАРАЛА І ВЫЦІРАЕ ЯЕ ПУРЫФІКАТАРАМ.

У КАНЦЫ МАЛІТВЫ ОЙЧА НАШ МЫ ПРОСІМ ЗБАВІЦЬ НАС АД ЗЛОГА. НАСТУПНАЯ МАЛІТВА РАЗВІВАЕ ГЭТУЮ ТЭМУ.

МЫ ПРОСІМ БОГА ЗБАВІЦЬ НАС АД:

МІНУЛАГА ЗЛА:
- ДРЭННЫХ ЗВЫЧАК
- НАШЫХ ГРАХОЎ

ЦЯПЕРАШНЯГА ЗЛА:
- СПАКУСАЎ
- ХВАРОБАЎ
- КЕПСКІХ СЯБРОЎ

БУДУЧАГА ЗЛА:
- СМЯРОТНЫХ ГРАХОЎ
- ТРАЎМАЎ
- ЗАЎЧАСНАЙ СМЕРЦІ.

ПРАМАЎЛЯЮЧЫ ГЭТУЮ МАЛІТВУ, СВЯТАР ТРЫМАЕ ПАТЭНУ, НА ЯКОЙ ПАДЧАС АФЕРТОРЫЯ АХВЯРАВАЛАСЯ ГОСТЫЯ. МЫ ПРОСІМ БОГА ПАМЯТАЦЬ ПРА НАШЫЯ ДАРЫ ПЕРАД ТЫМ, ЯК ПРАСІЦЬ ЯГО АБ ДАЛЕЙШАЙ ПРЫХІЛЬНАСЦІ.

СВЯТАР РОБІЦЬ ЗНАК КРЫЖА ПАТЭНАЙ.

МЫ РАЗВАЖАЕМ ПРА ЖАХІ ВАЙНЫ...

...І БАЛЮЧЫ НЕСПАКОЙ.

І МЫ МОЛІМСЯ АБ СУПАКОІ Ў СВЕЦЕ І НАШЫХ СЭРЦАХ.

КАЛІ ПАЗБАВІЦЦА АД ЗЛА ГРАХУ, ТО Ў СВЕЦЕ І Ў НАШЫХ СЭРЦАХ НАСТУПІЦЬ СУПАКОЙ.

ЦЯПЕР СВЯТАР КЛАДЗЕ СВЯТУЮ ГОСТЫЮ НА ПАТЭНУ.



ЗАКАНЧВАЮЧЫ МАЛІТВУ АБ ЗБАЎЛЕННІ АД ЗЛОГА, СВЯТАР БЯРЭ СВЯТУЮ ГОСТЫЮ І АСЦЯРОЖНА ЛАМАЕ ЯЕ НА ДЗВЕ ЧАСТКІ.

ЗАТЫМ ПАДЧАС МАЛІТВЫ ЁН АДЛОМВАЕ НЕВЯЛІКІ КАВАЛАЧАК АД АДНОЙ ПАЛОВЫ.

ЦЯПЕР НА АЛТАРЫ ЗНАХОДЗІЦЦА ТРЫ ФРАГМЕНТЫ СВЯТОЙ ГОСТЫІ.

ЦІ РАЗЛАМАНЫ ЕЗУС НА ТРЫ ЧАСТКІ?

НЕ, ЕЗУСА НЯМОЖНА ПАДЗЯЛІЦЬ — РАЗЛАМАНЫЯ ТОЛЬКІ АКЦЫДЭНЦЫІ (ТОЕ, ШТО МЫ МОЖАМ БАЧЫЦЬ).

У ЯКІМ ФРАГМЕНЦЕ ЕЗУС РЭАЛЬНА ПРЫСУТНІЧАЕ?

ЕЗУС ПРЫСУТНІЧАЕ РЭАЛЬНА, ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЦЮ Ў КОЖНЫМ З ТРОХ ФРАГМЕНТАЎ.

ЦІ АЗНАЧАЕ ГЭТА, ШТО НА АЛТАРЫ БОЛЬШ ЗА АДНАГО ЕЗУСА?

НЕ, ІСНУЕ ТОЛЬКІ АДЗІН ЕЗУС, АЛЕ ЁН ПРЫСУТНІЧАЕ Ў ТРОХ РОЗНЫХ МЕСЦАХ.

СВЯТАР ЛАМАЕ ГОСТЫЮ, КАБ ПОТЫМ АПУСЦІЦЬ НЕВЯЛІКІ КАВАЛАЧАК У КЕЛІХ.

ЗАТЫМ СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ЯШЧЭ АДНУ КАРОТКУЮ МАЛІТВУ.



ЗРАБІЎШЫ ЗНАК КРЫЖА НАД КЕЛІХАМ НЕВЯЛІКІМ ФРАГМЕНТАМ СВЯТОЙ ГОСТЫІ, СВЯТАР АПУСКАЕ ЯГО ЎСЯРЭДЗІНУ, КАБ ЦЕЛА ХРЫСТА ПАД ВЫГЛЯДАМ ХЛЕБА ЗМЯШАЛАСЯ З КРЫВЁЮ ХРЫСТА ПАД ВЫГЛЯДАМ ВІНА. ГЭТА НАГАДВАЕ НАМ, ШТО, ХОЦЬ КРОЎ ХРЫСТА І АДДЗЯЛІЛАСЯ АД ЯГОНАГА ЦЕЛА НА КРЫЖЫ...

...ЦЕЛА І КРОЎ З'ЯДНАЛІСЯ Ў ВЕЛІКОДНУЮ НЯДЗЕЛЮ, КАЛІ ХРЫСТУС У ХВАЛЕ ЎВАСКРОС З ПАМЕРЛЫХ.

ЗАТЫМ, УДАРАЮЧЫ СЯБЕ Ў ГРУДЗІ І ЗАКЛІКАЮЧЫ ХРЫСТА, СВЯТАР ЗНОЎ ПРОСІЦЬ АБ СУПАКОІ.

ЁН ЗАКЛІКАЕ НАШАГА ПАНА ПА ІМЕНІ, ЯКОЕ ЕЗУСУ ДАЎ ЯН ХРЫСЦІЦЕЛЬ, КАЛІ ЎБАЧЫЎ ЯГО НА БЕРАЗЕ ЯРДАНА.

ПРАРОК ІСАЯ І СВ. ЯН ЕВАНГЕЛІСТ ТАКСАМА НАЗЫВАЛІ ЕЗУСА ЯГНЁМ. МЫ ТАКСАМА ЧАСТА БАЧЫМ ВЫЯВУ ЯГНЯЦІ Ў НАШЫХ КАСЦЁЛАХ.

(У ІМШАХ-РЭКВІЕМАХ ТЫ ЗАЎВАЖЫШ, ШТО ЗАМЕСТ МАЛІТВЫ АБ СУПАКОІ ДЛЯ НАС МЫ ПРОСІМ БОЖАЕ ЯГНЯ ДАЦЬ ВЕЧНЫ СУПАКОЙ ДУШАМ У ЧЫСТЦЫ.)

ЦЯПЕР СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ТРЫ АДМЫСЛОВЫЯ МАЛІТВЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПРЫНЯЦЦЯ СВЯТОЙ КАМУНІІ.
ПЕРШАЯ З ГЭТЫХ МАЛІТВАЎ — ГЭТА МАЛІТВА АБ СУПАКОІ, АСАБЛІВА СУПАКОІ ДЛЯ КАСЦЁЛА.
(ГЭТАЯ МАЛІТВА ПРАПУСКАЕЦЦА Ў ІМШАХ ЗА ПАМЕРЛЫХ.)

(НА ЎРАЧЫСТАЙ ІМШЫ ПАСЛЯ ГЭТАЙ МАЛІТВЫ ПЕРАДАЕЦЦА ЗНАК СУПАКОЮ, КАБ ПАКАЗАЦЬ, ШТО ЎСЕ ЎДЗЕЛЬНІКІ ГЭТАЙ АХВЯРЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў МІРЫ АДЗІН З АДНЫМ.)

СВЯТАР: ПАНЕ ЕЗУ ХРЫСЦЕ, ТЫ СКАЗАЎ АПОСТАЛАМ ТВАІМ: СУПАКОЙ ПАКІДАЮ ВАМ, СУПАКОЙ МОЙ ДАЮ ВАМ. НЕ ЗВАЖАЙ НА ГРАХІ МАЕ, АЛЕ НА ВЕРУ КАСЦЁЛА ТВАЙГО І БУДЗЬ ЛАСКАВЫ ЗГОДНА З ТВАЁЙ ВОЛЯЙ АДАРЫЦЬ ЯГО СУПАКОЕМ І ЕДНАСЦЮ, ЯКІ ЖЫВЕШ І ВАЛАДАРЫШ, БОГ, ПРАЗ УСЕ ВЯКІ ВЕЧНЫЯ. АМЭН.

ПАНЕ ЕЗУ ХРЫСЦЕ, СЫНЕ БОГА ЖЫВОГА, ТЫ ПА ВОЛІ АЙЦА ПРЫ САДЗЕЯННІ ДУХА СВЯТОГА ПРАЗ СВАЮ СМЕРЦЬ ДАЎ ЖЫЦЦЁ СВЕТУ: ПРАЗ ГЭТАЕ НАЙСВЯЦЕЙШАЕ ЦЕЛА ТВАЁ І КРОЎ ВЫЗВАЛІ МЯНЕ АД УСІХ МАІХ ПРАВІНАЎ І АД УСЯГО ЗЛОГА. УЧЫНІ, КАБ Я ЗАЎСЁДЫ ТРЫМАЎСЯ ЗАПАВЕДЗЯЎ ТВАІХ І НЕ ДАПУСЦІ, КАБ Я АДЫШОЎ АД ЦЯБЕ, ЯКІ З ТЫМ ЖА АЙЦОМ І ДУХАМ СВЯТЫМ ЖЫВЕШ І ВАЛАДАРЫШ, БОГ, ПРАЗ УСЕ ВЯКІ ВЕЧНЫЯ. АМЭН.

ДРУГАЯ МАЛІТВА ПЕРАД СВЯТОЙ КАМУНІЯЙ — ГЭТА МАЛІТВА АБ ЕДНАСЦІ З ХРЫСТОМ.
МЫ ХОЧАМ БЫЦЬ ПОБАЧ З ІМ, ПАДПАРАДКОЎВАЮЧЫСЯ ЯГОНЫМ ЗАПАВЕДЗЯМ.

ПРЫНЯЦЦЕ ЦЕЛА ТВАЙГО, ПАНЕ ЕЗУ ХРЫСЦЕ, ЯКОЕ Я, НЯГОДНЫ, АСМЕЛЬВАЮСЯ СПАЖЫВАЦЬ, НЯХАЙ НЕ БУДЗЕ МНЕ НА СУД І АСУДЖЭННЕ, АЛЕ З МІЛАСЭРНАСЦІ ТВАЁЙ НЯХАЙ АХОЎВАЕ І АЗДАРАЎЛЯЕ МАЮ ДУШУ І ЦЕЛА. ЯКІ ЖЫВЕШ І ВАЛАДАРЫШ З БОГАМ АЙЦОМ У ЕДНАСЦІ ДУХА СВЯТОГА, БОГ, ПРАЗ УСЕ ВЯКІ ВЕЧНЫЯ. АМЭН.

ТРЭЦЯЯ МАЛІТВА — ГЭТА ПРОСЬБА ДА БОГА АБ ГОДНАЙ КАМУНІІ.

РЫХТУЮЧЫСЯ ПРЫНЯЦЬ КАМУНІЮ, ПАПРАСІ БОГА:

1. АБ БЛАГАСЛАЎЛЕННІ ДЛЯ КАСЦЁЛА.
2. АБ ДАПАМОЗЕ Ў ДОБРЫХ УЧЫНКАХ.
3. АБ ГОДНАЙ КАМУНІІ.

НЕПАСРЭДНА ПЕРАД СВЯТОЙ КАМУНІЯЙ СВЯТАР ТРОЙЧЫ ПРАМАЎЛЯЕ ВЕЛЬМІ ПРЫГОЖУЮ МАЛІТВУ. МІНІСТРАНТ ЗВОНІЦЬ У ЗВАНОЧАК.

КРЫХУ НАХІЛІСЯ І ЎДАРАЙ СЯБЕ Ў ГРУДЗІ ПРАВАЙ РУКОЮ.

ГЭТУ МАЛІТВУ Ў ПЕРШЫМ СТАГОДДЗІ ПРАМОВІЎ РЫМСКІ СОТНІК.

І БЫЎ АЗДАРОЎЛЕНЫ СЛУГА ЯГОНЫ Ў ТУЮ Ж ГАДЗІНУ.

ХОЦЬ МЫ І ВЕДАЕМ, ШТО МЫ НЕ ВАРТЫЯ ТАГО, КАБ ЕЗУС ПРЫЙШОЎ ДА НАС, МЫ ЎСЁ АДНО ЖАДАЕМ ГЭТАГА. І ЕЗУС ПРЫХОДЗІЦЬ ДА НАС У СВЯТОЙ КАМУНІІ, ТАМУ ШТО ЛЮБІЦЬ НАС.



СВЯТАР ПРЫМАЕ ЕЗУСА ПАД ВЫГЛЯДАМ ХЛЕБА І КРЫХУ ЗАТРЫМЛІВАЕЦЦА, ПАКУЛЬ ПРАГЛЫНАЕ ГОСТЫЮ І ДУМАЕ ПРА ЕЗУСА.

ПАДОБНА ЯК ЕЖА СТАНОВІЦЦА ЧАСТКАЙ НАС, КАЛІ МЫ СПАЖЫВАЕМ ЯЕ, ТАК І МЫ ЯДНАЕМСЯ З ЕЗУСАМ, КАЛІ ПРЫМАЕМ ЯГО Ў СВЯТОЙ КАМУНІІ.

ШТО МЫ АДДАДЗІМ ЕЗУСУ ЗА ЎСЁ, ШТО ЁН ДАЕ НАМ? ЁН АДДАЕ НАМ СЯБЕ. АДДАДЗІМ ЖА СЯБЕ І МЫ ЯМУ.



КАЛІ СВЯТАР ПРЫМАЕ ЕЗУСА ЯК ПАД ВЫГЛЯДАМ ХЛЕБА, ТАК І ПАД ВЫГЛЯДАМ ВІНА, ЁН МОЛІЦЦА, КАБ СВЯТАЯ ЭЎХАРЫСТЫЯ ЗАХАВАЛА ЯГОНУЮ ДУШУ НА ЖЫЦЦЁ ВЕЧНАЕ.

МЕНАВІТА ГЭТУЮ МАЛІТВУ СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ, КАЛІ ДАЕ НАМ СВЯТУЮ КАМУНІЮ.

СВЯТАР ПРАВОДЗІЦЬ ПАТЭНАЙ ПА КАРПАРАЛЕ, КАБ САБРАЦЬ УСЕ КРОШКІ, ЯКІЯ МАГЛІ ЗАСТАЦЦА АД СВЯТОЙ ГОСТЫІ.

ПРЫНЯЦЦЕ НАШАГА ПАНА Ў СВЯТОЙ КАМУНІІ — ГЭТА ЗАДАТАК ТАГО, ШТО МЫ ЎВАСКРЭСНЕМ З ПАМЕРЛЫХ І БУДЗЕМ ВЕЧНА ЖЫЦЬ У НЕБЕ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ ЧАСТКА ДЗЯСЯТАЯ

ЯК ПРЫМАЦЬ СВЯТУЮ КАМУНІЮ

КАЛІ ВЕРНІКІ ЗБІРАЮЦЦА ПРЫМАЦЬ НА ІМШЫ СВЯТУЮ КАМУНІЮ, ЯНЫ МОГУЦЬ ВЫХОДЗІЦЬ ДА АЛТАРНАЙ БАЛЮСТРАДЫ, ЯК ТОЛЬКІ МІНІСТРАНТ ЗАЗВОНІЦЬ У ЗВАНОЧАК ПРОСТА ПЕРАД ТЫМ, ЯК СВЯТАР ПРЫМАЕ СВЯТУЮ ГОСТЫЮ.

КАЛІ ТЫХ, ХТО ПРЫМАЕ КАМУНІЮ, ШМАТ, НЕ ВАРТА ЎСІМ СПЯШАЦЦА ЗРАБІЦЬ ГЭТА АДНАЧАСОВА.

КАЛІ ТЫ ЗБІРАЕШСЯ ПРЫНЯЦЬ КАМУНІЮ...



СКАЖЫ БОГУ, ШТО ШКАДУЕШ ЗА СВАЕ ГРАХІ, ПАКУЛЬ МІНІСТРАНТ ЧЫТАЕ CONFITEOR.

...ПАДЫДЗІ З ПАШАНАЙ, ЗВЁЎШЫ РУКІ.

ЗРАБІ ЗНАК КРЫЖА, КАЛІ ЯГО РОБІЦЬ СВЯТАР.

ПАГЛЯДЗІ НА ПАНА Ў ГОСТЫІ.

СВЯТАР ПРАМАЎЛЯЕ ГЭТУЮ МАЛІТВУ ТРОЙЧЫ. СКАЖЫ ЕЗУСУ, ШТО ХОЧАШ, КАБ ЁН ПРЫЙШОЎ ДА ЦЯБЕ.

КАЛІ СВЯТАР ПАДЫДЗЕ ДА ЦЯБЕ СА СВЯТОЙ КАМУНІЯЙ:

1. АДКРЫЙ РОТ.
2. ВЫСУНЬ ЯЗЫК.
3. ПАДЫМІ ГАЛАВУ (НЕ НАХІЛЯЙ І НЕ ЗАКІДАЙ ЯЕ).
4. СТОЙ НА КАЛЕНЯХ РОЎНА (АБАПІРАЙСЯ НА БАЛЮСТРАДУ).
5. НЕ АБАПІРАЙСЯ РУКАМІ Ў ПАДБАРОДАК.
6. АПУСЦІ ВОЧЫ (НЕ ЎГЛЯДАЙСЯ Ў СВЯТАРА).
7. ЗАКРЫЙ РОТ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК СВЯТАР ПАКЛАДЗЕ ТАБЕ НА ЯЗЫК ГОСТЫЮ.

ПРАВІЛЬНЫ СПОСАБ

НЕКАТОРЫЯ НЯПРАВІЛЬНЫЯ СПОСАБЫ

ПАСЛЯ ПРЫНЯЦЦЯ СВЯТОЙ КАМУНІІ:

1. ЗАПРАСІЎШЫ ДА СЯБЕ ПАНА, ПАДЫМІСЯ АД БАЛЮСТРАДЫ.

2. З ПАШАНАЙ ВЯРНІСЯ НА СВАЁ МЕСЦА.

3. ЯК НАЙХУТЧЭЙ ПРАГЛЫНІ ГОСТЫЮ.

4. ПА-САПРАЎДНАМУ ПАДЗЯКУЙ ПАНУ.

— СКАЖЫ ЕЗУСУ, ШТО ТЫ РАДЫ ЗАПРАСІЦЬ ЯГО ДА СЯБЕ.

— ПАПРАСІ ЯГО ЗАСТАЦЦА З ТАБОЙ НАЗАЎСЁДЫ.

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ ЧАСТКА АДЗІНАЦЦАТАЯ

ПАДЗЯКА ЗА ВЯЧЭРУ

ЦЯПЕР МОЖАШ СЕСЦІ.

МАЛІТВЫ, ЯКІМІ МЫ НА ІМШЫ ДЗЯКУЕМ БОГУ ЗА НАВЕДВАННЕ НАС У СВЯТОЙ КАМУНІІ, ВЕЛЬМІ КАРОТКІЯ. ПАСЛЯ ІМШЫ ЛЕПШ ЗАСТАЦЦА Ў СВЯТЫНІ І ПАДЗЯКАВАЦЬ БОГУ АСАБІСТА.

У САМОЙ ІМШЫ ЁСЦЬ ЧАТЫРЫ МАЛІТВЫ ПАДЗЯКІ.

ПЕРШЫЯ ДЗВЕ ПРАМАЎЛЯЮЦЦА, КАЛІ СВЯТАР АБМЫВАЕ КЕЛІХ.

СПАЧАТКУ СВЯТАР НАБІРАЕ КРЫХУ ВІНА Ў КЕЛІХ І ВЫПІВАЕ ЯГО, КАБ САБРАЦЬ УСЕ КРОПЛІ НАЙДАРАЖЭЙШАЙ КРЫВІ, ЯКІЯ МАГЛІ ЗАСТАЦЦА Ў КЕЛІХУ. КАЛІ МІНІСТРАНТ НАЛІВАЕ ВІНО, СВЯТАР ЧЫТАЕ ПЕРШУЮ МАЛІТВУ.

ПОТЫМ СВЯТАР ВІНОМ І ВАДОЙ ЗМЫВАЕ З КОНЧЫКАЎ ПАЛЬЦАЎ У КЕЛІХ ТОЕ, ШТО НА ІХ ЗАСТАЛОСЯ АД ГОСТЫІ. У ГЭТЫ ЧАС ЁН ПРАМАЎЛЯЕ ДРУГУЮ МАЛІТВУ.

ГЭТЫЯ МАЛІТВЫ ПАДКАЖУЦЬ ТАБЕ, ЯК МАЛІЦЦА ПАСЛЯ КАМУНІІ:

1. ПАПРАСІ ЕЗУСА ЗАСТАВАЦЦА З ТАБОЮ.

2. ПАПРАСІ ЕЗУСА БЛАГАСЛАВІЦЬ ЦЯБЕ.

3. ПАПРАСІ ЕЗУСА ЗАХАВАЦЬ ЦЯБЕ АД УСЯКАГА ГРАХУ.

СВЯТАР ВЫЦІРАЕ ПАЛЬЦЫ І КЕЛІХ ПУРЫФІКАТАРАМ.



СВЯТАР ВЫПІВАЕ ВАДУ З ВІНОМ.

СВЯТАР ВЫЦІРАЕ КЕЛІХ І НАКРЫВАЕ ЯГО, А ЗАТЫМ ІДЗЕ ДА ІМШАЛА І ЧЫТАЕ ТРЭЦЮЮ І ЧАЦВЁРТУЮ МАЛІТВЫ ПАДЗЯКІ.

АБЕДЗВЕ ГЭТЫЯ МАЛІТВЫ ЗМЯНЯЮЦЦА Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД СВЯТА.

ПЕРШАЯ ЗАВЕЦЦА АНТЫФОНАЙ НА КАМУНІЮ. ЯНА ВЕЛЬМІ КАРОТКАЯ І НАГАДВАЕ АНТЫФОНУ АФЕРТОРЫЯ Ў ПАЧАТКУ ІМШЫ ВЕРНІКАЎ.



АНТЫФОНА НА КАМУНІЮ ЧАСТА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЕРШАМ ПСАЛЬМА. У РАННІЯ ГАДЫ КАСЦЁЛА ПСАЛЬМ СПЯВАЎСЯ ЦАЛКАМ, ПАКУЛЬ ВЕРНІКІ ПРЫСТУПАЛІ ДА СВЯТОЙ КАМУНІІ.

ЕЗУС ПРАБЫВАЕ З ТАБОЮ. КАЛІ ТЫ НЕ АДЧУВАЕШ СЯБЕ ВЕЛЬМІ ШЧАСЛІВЫМ ПАСЛЯ ПРЫНЯЦЦЯ КАМУНІІ, ТО ГЭТА, МАГЧЫМА, ТАМУ, ШТО ТЫ НЕ ДУМАЕШ ПРА ЕЗУСА ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ПРЫНЯЎ ЯГО.

ЧАЦВЁРТАЯ МАЛІТВА ПАДЗЯКІ ЗАВЕЦЦА МАЛІТВАЙ ПАСЛЯ КАМУНІІ.

ЧАСАМ ГЭТА АДНА МАЛІТВА, А ЧАСАМ НАБОР МАЛІТВАЎ. МАЛІТВА ПАСЛЯ КАМУНІІ АДПАВЯДАЕ КАЛЕКЦЕ І САКРЭЦЕ.

ПАКОЛЬКІ ГЭТА НАЙВАЖНЕЙШАЯ З МАЛІТВАЎ ПАДЗЯКІ, СВЯТАР ВІТАЕ НАС ПЕРАД ЁЮ, КАБ МЫ ЗВЯРНУЛІ НА ЯЕ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ. ПОТЫМ ЁН ПРАМАЎЛЯЕ МАЛІТВУ ПАСЛЯ КАМУНІІ З РАЗВЕДЗЕНЫМІ РУКАМІ, ЯК РАБІЎ ГЭТА Ў ВЫПАДКУ КАЛЕКТЫ.

МАЛІТВЫ ПАСЛЯ КАМУНІІ — ГЭТА АФІЦЫЙНЫЯ МАЛІТВЫ ПАДЗЯКІ ЗА СВЯТУЮ КАМУНІЮ АД ЎСЯГО КАСЦЁЛА. ЯНЫ ЗАЎСЁДЫ ЗВЕРНУТЫЯ ДА АЙЦА ПРАЗ СЫНА Ў ЕДНАСЦІ СВЯТОГА ДУХА.

(ЧАСАМ ПРАДПІСАНА АСАБЛІВАЕ АПОШНЯЕ ЕВАНГЕЛЛЕ, І СВЯТАР МУСІЦЬ ПРАЧЫТАЦЬ ЯГО З ІМШАЛА. У ТАКІМ ВЫПАДКУ ЁН ПАКІДАЕ КНІГУ АДКРЫТАЙ, І МІНІСТРАНТ ВЕДАЕ, ШТО ЯЕ ТРЭБА ПЕРАНЕСЦІ НА БОК ЕВАНГЕЛЛЯ.)

ВЕДАЙ СВАЮ ІМШУ — ЧАСТКА ДВАНАЦЦАТАЯ

АПОШНІЯ НАСТАЎЛЕННІ

ГАЛОЎНАЯ ЧАСТКА ІМШЫ СКОНЧЫЛАСЯ. МЫ ПРЫНЕСЛІ АХВЯРУ І ПРЫНЯЛІ СВЯТУЮ КАМУНІЮ. АЛЕ ПЕРАД ТЫМ ЯК МЫ ПОЙДЗЕМ СА СВЯТЫНІ, КАСЦЁЛ ХОЧА ДАЦЬ НАМ АПОШНІЯ НАСТАЎЛЕННІ.

АПОШНЯЯ ЧАСТКА ІМШЫ ЎКЛЮЧАЕ Ў СЯБЕ ТРЫ РЭЧЫ:

1. МЫ АТРЫМЛІВАЕМ НАСТАЎЛЕННІ.
2. МЫ АТРЫМЛІВАЕМ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ, КАБ МАГЧЫ ВЫКАНАЦЬ ГЭТЫЯ НАСТАЎЛЕННІ.
3. НАМ НАГАДВАЮЦЬ ТОЕ, ЧАМУ БОГ НАВУЧЫЎ НАС, КАБ МЫ ВЕДАЛІ, ЯКІМ ЧЫНАМ ВЫКАНАЦЬ НАСТАЎЛЕННІ.

СТАНЬ НА КАЛЕНІ.

СПАЧАТКУ СВЯТАР ПАВАРОЧВАЕЦЦА ДА ВЕРНІКАЎ І КАЖА: "ІДЗІЦЕ, ІМША ЗДЗЕЙСНІЛАСЯ".

МЫ ПАЯДНАЛІСЯ З ЕЗУСАМ НА КРЫЖЫ.
ЕЗУС ПРЫЙШОЎ ДА НАС.
ЦЯПЕР МЫ ПАВІННЫ ПРЫНЕСЦІ ЕЗУСА СВЕТУ:
— СВАЁЙ ПРАЦАВІТАСЦЮ,
— ДАБРЫНЁЙ ДА ІНШЫХ,
— СВАІМ ДОБРЫМ ПРЫКЛАДАМ,
— ВЫКАНАННЕМ ТАГО, ЧАГО ЖАДАЕ БОГ.

МЫ ВЕДАЕМ, ШТО РАБІЦЬ. КАБ У НАС БЫЛІ СІЛЫ ДЛЯ ВЫКАНАННЯ ГЭТЫХ РЭЧАЎ, СВЯТАР УДЗЯЛЯЕ НАМ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ КАСЦЁЛА. ПАКОЛЬКІ ГЭТАЕ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ АПОШНЯЕ НА ІМШЫ, ЯНО ЗАВЕЦЦА АПОШНІМ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕМ.

ПЕРАД ТЫМ ЯК УДЗЯЛІЦЬ БЛАГАСЛАЎЛЕННЕ, СВЯТАР СХІЛЯЕЦЦА І МОЛІЦЦА ДА СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ. ЁН НАГАДВАЕ БОГУ ПРА АХВЯРУ, ЯКУЮ МЫ ТОЛЬКІ ШТО СКЛАЛІ. ЗАТЫМ ЁН БЛАГАСЛАЎЛЯЕ НАС У ІМЯ ТРОЙЦЫ.

ПАДЫМІСЯ НА АПОШНЯЕ ЕВАНГЕЛЛЕ.

ПАСЛЯ БЛАГАСЛАЎЛЕННЯ СВЯТАР РОБІЦЬ ТОЕ, ШТО МОЖА ВЫДАВАЦЦА ДЗІЎНЫМ. ЁН ІДЗЕ НА БОК ЕВАНГЕЛЛЯ І ЧЫТАЕ АПОШНЯЕ ЕВАНГЕЛЛЕ. ЧАСАМ ГЭТА АСАБЛІВАЕ ЕВАНГЕЛЛЕ, АЛЕ ЗАЗВЫЧАЙ ГЭТА АДЗІН І ТОЙ ЖА ЎРЫВАК З САМАГА ПАЧАТКУ ЕВАНГЕЛЛЯ АД СВЯТОГА ЯНА.

ЧАМУ СВЯТАР РОБІЦЬ ГЭТА Ў САМЫМ КАНЦЫ ІМШЫ?

ЁН РОБІЦЬ ГЭТА, КАБ НАГАДАЦЬ НАМ НАСТАЎЛЕННІ, ЯКІЯ МЫ АТРЫМАЛІ ПАДЧАС ІМШЫ КАТЭХУМЭНАЎ. КАЛІ МЫ ЗБІРАЕМСЯ НЕСЦІ ЕЗУСА Ў СВЕТ, МЫ ПАВІННЫ ПАМЯТАЦЬ ПРА ГЭТЫЯ НАСТАЎЛЕННІ.



МЫ ЗНОЎ РОБІМ ЗНАКІ КРЫЖА Ў ПАЧАТКУ ЕВАНГЕЛЛЯ.

МЫ ПРОСІМ БОГА БЫЦЬ У НАШЫМ РОЗУМЕ, СЭРЦЫ І НА НАШЫХ ВУСНАХ.

СВЯТАР: НА ПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА, І СЛОВА БЫЛО Ў БОГА, І БОГАМ БЫЛО СЛОВА. ЯНО БЫЛО Ў БОГА НА ПАЧАТКУ. УСЁ ПРАЗ ЯГО СТАЛАСЯ, І БЕЗ ЯГО НІЧОГА НЕ СТАЛАСЯ З ТАГО, ШТО СТАЛАСЯ. У ІМ БЫЛО ЖЫЦЦЁ, І ЖЫЦЦЁ БЫЛО СВЯТЛОМ ЛЮДЗЕЙ. А СВЯТЛО СВЕЦІЦЬ Ў ЦЕМРЫ, І ЦЕМРА НЕ АГАРНУЛА ЯГО. З'ЯВІЎСЯ ЧАЛАВЕК, ПАСЛАНЫ АД БОГА, ІМЯ ЯГОНАЕ БЫЛО ЯН. ЁН ПРЫЙШОЎ ДЗЕЛЯ СВЕДЧАННЯ, КАБ ЗАСВЕДЧЫЦЬ ПРА СВЯТЛО, КАБ УСЕ ПАВЕРЫЛІ ПРАЗ ЯГО. НЕ БЫЎ ЁН СВЯТЛОМ, АЛЕ БЫЎ ПАСЛАНЫ ДАЦЬ СВЕДЧАННЕ ПРА СВЯТЛО. БЫЛО СВЯТЛО ПРАЎДЗІВАЕ, ЯКОЕ АСВЯТЛЯЕ КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА, ЯКІ ПРЫХОДЗІЦЬ Ў СВЕТ. У СВЕЦЕ БЫЛО СЛОВА, І СВЕТ ПРАЗ ЯГО СТАЎСЯ, І СВЕТ НЕ ПАЗНАЎ ЯГО. ДА СВАЙГО ПРЫЙШЛО, І СВАЕ ЯГО НЕ ПРЫНЯЛІ. А ТЫМ, ХТО ПРЫНЯЎ ЯГО, ДАЛО ЎЛАДУ СТАЦЬ БОЖЫМІ ДЗЕЦЬМІ, ТЫМ, ХТО ВЕРЫЦЬ У ІМЯ ЯГОНАЕ, ХТО НЕ АД КРЫВІ, І НЕ АД ЖАДАННЯ ЦЕЛА, І НЕ АД ЖАДАННЯ МУЖА, АЛЕ АД БОГА НАРАДЗІЎСЯ.

КАЛІ МЫ ВЫЙДЗЕМ З КАСЦЁЛА, КАБ ПРАЦАВАЦЬ ДЛЯ БОГА Ў СВЕЦЕ, МЫ ПАВІННЫ ПАМЯТАЦЬ...

ШТО ЎВЕСЬ СВЕТ НАЛЕЖЫЦЬ БОГУ... ШТО БОЖЫ СЫН СТАЎ ЧАЛАВЕКАМ ДЗЕЛЯ НАС...



ШТО ЕЗУС ПАМЁР, КАБ ВЫЗВАЛІЦЬ УСІХ ЛЮДЗЕЙ АД ІХНІХ ГРАХОЎ…

ШТО АДНОЙЧЫ ЕЗУС ПРЫЙДЗЕ Ў СЛАВЕ, КАБ ДАЦЬ ВЕЧНАЕ ЖЫЦЦЁ ТЫМ, ХТО ЛЮБІЦЬ ЯГО.

© D. Manousos, 1954
© М. А. Фоміч, пер. на бел. мову, 2026